Г. Л. Мураўёва, М. А. Урбан

# МАТЭМАТЫКА

## 3




## Частка 1

## Табліца множання

| · : | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 2 | 4 | 6 | 8 | 10 | 12 | 14 | 16 | 18 |
| 3 | 6 | 9 | 12 | 15 | 18 | 21 | 24 | 27 |
| 4 | 8 | 12 | 16 | 20 | 24 | 28 | 32 | 36 |
| 5 | 10 | 15 | 20 | 25 | 30 | 35 | 40 | 45 |
| 6 | 12 | 18 | 24 | 30 | 36 | 42 | 48 | 54 |
| 7 | 14 | 21 | 28 | 35 | 42 | 49 | 56 | 63 |
| 8 | 16 | 24 | 32 | 40 | 48 | 56 | 64 | 72 |
| 9 | 18 | 27 | 36 | 45 | 54 | 63 | 72 | 81 |

Пры множанні 1 на лік атрымліваецца лік, на які множылі.

$1 \cdot a = a$

Пры множанні ліку на 1 атрымліваецца лік, які множылі.

$a \cdot 1 = a$

Пры множанні 0 на лік атрымліваецца 0.

$0 \cdot a = 0$

Пры множанні ліку на 0 атрымліваецца 0.

$a \cdot 0 = 0$

Пры дзяленні ліку на 1 атрымліваецца лік, які дзялілі.

$a : 1 = a$

Пры дзяленні ліку на гэты ж лік атрымліваецца 1.

$a : a = 1$

Пры дзяленні 0 на лік атрымліваецца 0.

$0 : a = 0$

Дзяліць на 0 нельга!

$a : 0$

## Парадак дзеянняў у выразах

Калі ў выразе НЯМА ДУЖАК і ён утрымлівае толькі складанне і адніманне, то дзеянні выконваюць па парадку злева направа.

$30 \overset{1}{-} 5 \overset{2}{+} 10$

Калі ў выразе НЯМА ДУЖАК і ён утрымлівае толькі множанне і дзяленне, то дзеянні выконваюць па парадку злева направа.

$6 \overset{1}{:} 2 \overset{2}{\cdot} 5$

У выразах БЕЗ ДУЖАК спачатку выконваюць множанне або дзяленне (злева направа), а потым складанне або адніманне (злева направа).

$8 \overset{1}{\cdot} 2 + 9 \overset{2}{\cdot} 4$

$100 - 72 \overset{2}{:} 9 + 4$

Калі ў выразе ЁСЦЬ ДУЖКІ і ён утрымлівае толькі складанне і адніманне, то дзеянні ў дужках выконваюць першымі.

$50 - (23 \overset{1}{+} 17)$

$(62 - 48) \overset{2}{+} 14$

У выразах З ДУЖКАМІ спачатку вылічваюць значэнні выразаў у дужках. Затым выконваюць множанне або дзяленне (злева направа), а потым складанне або адніманне (злева направа).

$6 \overset{2}{\cdot} (2 + 7) \overset{3}{-} 42$

$56 \overset{2}{:} 7 + (100 \overset{1}{-} 45)$

## Уласцівасці складання і множання

### Перамяшчальная ўласцівасць

складання

$a + b = b + a$

множання

$a \cdot b = b \cdot a$

### Спалучальная ўласцівасць складання

$(a + b) + c = a + (b + c)$

### Размеркавальная ўласцівасць множання

$(a + b) \cdot c = a \cdot c + b \cdot c$

## Перыметр прамавугольніка, квадрата

Перыметр абазначаецца лацінскай літарай ***P***.




### Перыметр прамавугольніка

$P = (a + b) \cdot 2$

### Перыметр квадрата

$P = a \cdot 4$

## Множанне двухзначнага ліку на адназначны



$34 \cdot 2 = 30 \cdot 2 + 4 \cdot 2 = 68$

30 4

## Дзяленне двухзначнага ліку на адназначны



$36 : 3 = 30 : 3 + 6 : 3 = 12$

30 6



$36 : 2 = 20 : 2 + 16 : 2 = 18$

20 16

## Дзяленне двухзначнага ліку на двухзначны




$48 : 12 = ?$

$2 \cdot 12 = 24$

$3 \cdot 12 = 36$

$4 \cdot 12 = 48$

## Лацінскія літары

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| *Aa* | *Bb* | *Cc* | *Dd* | *Kk* | *Ll* | *Mm* | *Nn* | *Oo* | *Pp* |
| а | бэ | цэ | дэ | ка | эль | эм | эн | о | пэ |

Г. Л. Мураўёва, М. А. Урбан

# МАТЭМАТЫКА

Вучэбны дапаможнік для **3** класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання

У дзвюх частках

**Частка 1**

*Дапушчана*
*Міністэрствам адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

Мінск

Нацыянальны інстытут адукацыі
2021

Правообладатель Национальный институт образования

УДК 51(075.2=161.3)
ББК 22.1я71
М91

Р э ц э н з е н т ы:

дацэнт кафедры дашкольнай і пачатковай адукацыі ўстановы адукацыі «Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава», кандыдат педагагічных навук, дацэнт *З. К. Ляўчук*;

метадычнае аб'яднанне настаўнікаў пачатковых класаў дзяржаўнай установы адукацыі «Гімназія № 146 г. Мінска» (настаўнік пачатковых класаў вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі *С. А. Фёдарава*)

## Умоўныя абазначэнні:

— кажы і разважай так;

— адкажы на цікавае пытанне;

 — «дружныя» задачы — рашы іх па чарзе;

— выканай заданне ў пары (групе);

— правер сябе;

— выканай заданне дома;

— спасылкі на матэрыял рубрыкі «Гэта цікава!» (выкарыстоўвай смартфон або планшэт).

**ISBN 978-985-594-950-4 (ч. 1)**
**ISBN 978-985-594-949-8**

© Мураўёва Г. Л., Урбан М. А., 2021
© Афармленне. НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі», 2021

Правообладатель Национальный институт образования

## Змест

Паўтарэнне вывучанага ў 2-м класе ..... 4

Множанне і дзяленне ..... 28






Правообладатель Национальный институт образования

# Урок 1

## Паўтарэнне вывучанага ў 2-м класе

**1.** Запішы лікі. Колькі дзясяткаў? Колькі адзінак?




**2.** Напішы лікі лічбамі.

| | | |
|---|---|---|
| пяцьдзясят сем | дзевяноста | сорак чатыры |
| дваццаць адзін | сто | восемдзесят тры |

**3.** Запішы, колькі дзясяткаў і адзінак у ліках па ўзоры.

58 = 5 дзяс. 8 адз. | 25 | 32 | 84 | 61 | 77 | 94

**4.** Запішы лікі ў выглядзе сумы разрадных складаемых па ўзоры.

73 = 70 + 3 | 35 | 53 | 91 | 19 | 38 | 83

**5.** Знайдзі значэнні выразаў.

| | | |
|---|---|---|
| 60 + 7 | 56 + 1 | 20 + 40 – 10 |
| 67 – 7 | 80 – 1 | 70 – 30 + 50 |
| 67 – 60 | 100 – 1 | 60 + 40 – 100 |

**6.** Рашы задачу. Складзі адваротныя задачы.
Калі прадалі 9 кг цыбулі, засталося 30 кг цыбулі. Колькі кілаграмаў цыбулі было?



Правообладатель Национальный институт образования

**7.** У вагоне метро было 40 пасажыраў. На станцыі выйшлі 10 мужчын і столькі ж жанчын. Колькі пасажыраў засталося ў вагоне?

**8.** Выберы схему. Рашы задачу.
У парку 45 ліп і бяроз, а ліп і клёнаў — 50. Чаго больш — бяроз або клёнаў? На колькі дрэў больш?

1




2




**9.** Колькі прамых вуглоў? Вострых вуглоў? Тупых вуглоў?




**1.** Вылічы.
78 – 8 49 + 1 50 – 20 + 70

**2.** У сталовую прывезлі 70 кг садавіны. Яблыкаў было 30 кг, груш — 20 кг, астатнія — слівы. Колькі кілаграмаў сліў прывезлі?



Правообладатель Национальный институт образования

# Урок 2

**1.** Прачытай роўнасць 24 + 42 = 66, выкарыстоўваючы словы: дадаць, плюс, павялічыць, сума.

**2.** Растлумач вылічэнні.

47 + 3 → 40 ?

64 + 28 → ? 8

**3.** Вылічы.

| | | | |
|---|---|---|---|
| 34 + 45 | 27 + 36 | 58 + 14 | 63 + 37 |
| 60 + 39 | 49 + 24 | 28 + 46 | 45 + 55 |

**4.** Прачытай роўнасць 75 – 32 = 43, выкарыстоўваючы словы: адняць, мінус, паменшыць, рознасць.

**5.** Растлумач вылічэнні.

88 – 45 → ? 8 40 ?

43 – 25 → 20 ?

**6.** Вылічы.

| | | | |
|---|---|---|---|
| 77 – 35 | 60 – 28 | 53 – 27 | 100 – 85 |
| 88 – 46 | 80 – 63 | 42 – 37 | 100 – 92 |

**7.** Параўнай.

| | | |
|---|---|---|
| 56 + 14 ? 70 | 33 ? 26 + 9 | 60 – 37 ? 13 |
| 66 + 24 ? 80 | 46 ? 50 – 6 | 75 – 50 ? 20 |

**8.** На колькі гадоў Таня старэйшая за Івана, калі Івану 8 гадоў, Тані 13 гадоў, а Пецю 9 гадоў?

**9.** Калі ў кошык паклалі 15 баравікоў і 25 чырвонагаловікаў, у ім стала 62 грыбы. Колькі грыбоў было ў кошыку спачатку?



Правообладатель Национальный институт образования

**10.** Знайдзі даўжыню ломанай.



**11.** Назаві фігуры, у якіх перыметр роўны даўжыні ломанай з задання 10.



**12.** У класе было 4 дзяўчынкі і 6 хлопчыкаў. З класа выйшлі 5 дзяцей. Ці быў сярод іх хоць адзін хлопчык?

Яна кажа:

З класа маглі выйсці ўсе хлопчыкі.

Алесь кажа:

З класа маглі выйсці ўсе дзяўчынкі.

Чыя праўда?

**1.** Знайдзі значэнні выразаў.

63 – 29 75 + 15 100 – 55 + 45

**2.** У магазіне было 34 пакупнікі. Спачатку выйшлі 15 пакупнікоў, а потым прыйшлі 7 пакупнікоў. Колькі пакупнікоў стала ў магазіне?



Правообладатель Национальный институт образования

# Урок 3

**1.** Растлумач, як Алесь запісаў у слупок і знайшоў суму лікаў 37 і 25.




1. Пішу дзясяткі пад дзясяткамі, адзінкі пад адзінкамі.
2. Складваю адзінкі...
3. Складваю дзясяткі...
4. Чытаю адказ...

**2.** Запішы ў слупок. Вылічы.

| | | |
|---|---|---|
| 23 + 62 | 25 + 18 | 36 + 20 + 44 |
| 77 + 13 | 73 + 27 | 57 + 18 + 25 |

**3.** Растлумач, як Яна запісала ў слупок і знайшла розніцу лікаў 42 і 26.




1. Пішу дзясяткі пад дзясяткамі, адзінкі пад адзінкамі.
2. Аднімаю адзінкі...
3. Аднімаю дзясяткі...
4. Чытаю адказ...

**4.** Запішы ў слупок. Вылічы.

| | | |
|---|---|---|
| 59 – 36 | 81 – 34 | 100 – 61 |
| 70 – 44 | 62 – 58 | 100 – 94 |

**5.** Знайдзі значэнні выразаў.

| | | |
|---|---|---|
| 53 – 25 + 26 | 69 + 30 – 82 | 100 – 48 – 19 |

**6.** Параўнай.

| | |
|---|---|
| 15 см ? 5 дм | 7 дм 6 см ? 76 см |
| 71 см ? 7 дм | 8 дм 1 см ? 1 м |
| 10 дм ? 1 м | 2 дм 6 см ? 62 см |



Правообладатель Национальный институт образования

**7.** Якіх фігур больш — трохвугольнікаў або чатырохвугольнікаў? На колькі больш?



**8.** Выберы схему. Рашы задачу.
Пяць трэцякласнікаў узялі ў бібліятэцы 7 кніг, а часопісаў — на 4 больш. Колькі ўсяго кніг і часопісаў узялі трэцякласнікі ў бібліятэцы?

1




2




3




**9.** Складзі і рашы задачу.

Было — ?
Паехалі — 15 ... і 23 ... .
Засталося — 22 ... .

**10.** Кожны дарослы вядзе за руку дваіх дзяцей. Колькі дзяцей ідуць на прагулку, калі дарослых 5 чалавек?

**1.** Запішы ў слупок. Вылічы.
28 + 53 56 – 29 70 – 48 41 + 59

**2.** У ба́ку машыны было 45 л бензіну. Для паездкі ад дома да возера зрасходавалі 12 л бензіну, а для таго, каб вярнуцца дадому, — столькі ж літраў бензіну. Колькі літраў бензіну засталося ў баку?



Правообладатель Национальный институт образования

# Урок 4

**1.** Алесь і Яна выканалі праверку складання лікаў 25 і 34 адніманнем.

25 + 34 = 59
59 – 34 = 25

25 + 34 = 59
59 – 25 = 34

Чыя праўда?

**2.** Вылічы. Выканай праверку.

35 + 16 29 + 64 28 + 43 57 + 19

**3.** Запішы ў слупок. Вылічы.

46 + 28 23 + 39 17 + 28 + 35
62 + 31 54 + 46 23 + 41 + 36

**4.** Выпішы правільныя роўнасці.

25 + 12 | 13 < 40 | 50 – 25 – 25 = 1

15 + 85 = 100 | 99 – 99 | 100 – 60 + 2 = 42

**5.** Устаў прапушчаныя лікі, каб роўнасці былі правільныя.

78 + ? = 84 65 – ? = 39 ? – 52 = 48
76 + ? = 86 67 – ? = 37 ? – 54 = 46
74 + ? = 88 69 – ? = 35 ? – 56 = 44

Якой можа быць наступная роўнасць у кожным слупку?

**6.** Вылічы.

1 дм + 2 см 32 см + 4 дм 1 см – 5 дм 9 см
5 см + 2 дм 3 дм 8 см + 20 см – 1 дм 6 см
1 дм + 9 дм 5 дм 2 см – 37 см + 2 дм 5 см



Правообладатель Национальный институт образования

**7.** У халадзільніку было 2 дзясяткі белых яек і яшчэ 6 штук каляровых. Колькі яек стала ў халадзільніку, калі ў яго паклалі яшчэ 8 яек?

**8.** Спачатку адрэзалі 13 м тасьмы, а потым — яшчэ 22 м. Засталося 19 м. Колькі метраў тасьмы было?

**9.** Даведайся па календары, колькі дзён у асенніх месяцах. Рашы задачу.
Восенню было 28 дажджлівых дзён. Колькі было восенню недажджлівых дзён?

**10.** Выберы схему.
Дарожка ад увахода ў парк да атракцыёнаў паварочвае тры разы пад прамым вуглом і адзін раз пад непрамым вуглом.

1

2

3



**11.** Знайдзіце даўжыню паркавай дарожкі з задання 10, калі кожны сантыметр на схеме абазначае 10 м даўжыні дарожкі.

**1.** Вылічы. Выканай праверку.

57 + 42 39 + 9 60 + 15 77 + 23

**2.** У кнізе 58 старонак. У нядзелю Ясь прачытаў 14 старонак і ў панядзелак — столькі ж старонак. Колькі старонак засталося прачытаць Ясю?



Правообладатель Национальный институт образования

# Урок 5

**1.** Растлумач, як Алесь выканаў праверку аднімання лікаў 64 і 41 складаннем.

$$\begin{array}{l} \underline{64 - 41 = 23} \\ 23 + 41 = 64 \end{array}$$

**2.** Вылічы. Выканай праверку складаннем.

75 – 30 46 – 24 68 – 18 55 – 27

**3.** Запішы ў слупок. Вылічы. Выканай праверку складаннем.

67 – 48 97 – 39 100 – 28 100 – 71

**4.** Дапоўні лікі да 100. Састаў сумы.

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 91 | 70 | 65 | 40 | 10 | 39 | 7 | 0 |

**5.** Устаў прапушчаныя лікі, каб роўнасці былі правільныя.

65 + ? = 93 ? + 34 = 77 ? – 39 = 61

**6.** Рашы задачу. Складзі адваротныя задачы.

Для рамонту магазіна купілі цэмент у мяшках. Калі зрасходавалі 26 мяшкоў цэменту, засталося 15 мяшкоў. Колькі мяшкоў цэменту купілі?

**7.** На малюнках паказана, а якой гадзіне Даша пачала і закончыла чытаць кнігу. Колькі мінут Даша чытала кнігу?

Было



Стала





Правообладатель Национальный институт образования

**8.** Выберы схему. Рашы задачу.
У Грышы 12 машынак. Калі яго сястры Міле падарылі 3 лялькі, у яе стала столькі ж лялек, колькі машынак у Грышы. Колькі лялек было ў Мілы?

1



2



3



**9.** Наташа зрабіла 15 фотаздымкаў. Гэта на 7 фотаздымкаў менш, чым зрабіла Мілана. Колькі фотаздымкаў зрабілі дзяўчынкі?

**10.** Назаві фігуры. Знайдзі перыметры фігур.



**11.** Сабака на 4 кг цяжэйшы за кошку. Маса дзвюх кошак роўная масе аднаго сабакі. Якая маса кошкі? Маса сабакі?

**1.** Вылічы. Выканай праверку складаннем.
50 – 31 48 – 23 63 – 37 100 – 36

**2.** У вазе ляжала некалькі цукерак. У вазу паклалі 7 шакаладных цукерак і 8 карамелек. У вазе стала 30 цукерак. Колькі цукерак было ў вазе?



Правообладатель Национальный институт образования

## Урок 6

**1.** Растлумач, як Яна выканала праверку аднімання лікаў 78 і 47 адніманнем.

78 – 47 = 31
78 – 31 = 47

**2.** Вылічы. Выканай праверку адніманнем.

73 – 23 55 – 38 90 – 46 83 – 40

**3.** Запішы ў слупок. Вылічы. Выканай праверку адніманнем.

94 – 31 52 – 39 100 – 55 62 – 26

**4.** Выканай дзеянні. Вынік запішы ў дэцыметрах і сантыметрах.

26 см + 9 см – 14 см
75 см – 30 см + 16 см
90 см – 2 дм + 4 см
6 дм – 30 см + 42 см
1 м – 5 дм – 1 см
1 м – 9 дм + 4 см

**5.** Выпішы правільныя няроўнасці.

30 > 40 | 99 < 25 + 75 | 55 + 0 < 55 | 80 – 1 > 77

**6.** Устаў прапушчаныя знакі, каб роўнасці былі правільныя.

22 ? 8 ? 4 = 26
73 ? 7 ? 8 = 88

**7.** Даўжыня адной стараны трохвугольніка — 30 см, другой — столькі ж сантыметраў. Знайдзі даўжыню трэцяй стараны трохвугольніка, калі перыметр трохвугольніка роўны 8 дм.

**8.** Кастусь раніцай 15 мін робіць зарадку, 10 мін мыецца і 20 мін снедае. Ці хопіць яму гадзіны, каб паспець выканаць усе гэтыя справы?



Правообладатель Национальный институт образования

**9.** Дапоўні задачу данымі схемы. Рашы задачу.
Пасадзілі ? дрэў. З іх — ? дубоў, астатнія — каштаны. На колькі больш каштанаў, чым дубоў, пасадзілі?




**10.** Выберы задачу, якая падыходзіць да першай схемы і да другой схемы. Рашы задачы.

- Радзіслава цяжэйшая за Юру на 15 кг, а Сяргей цяжэйшы за Юру на 25 кг. На колькі кілаграмаў Сяргей цяжэйшы за Радзіславу?
- Радзіслава цяжэйшая за Юру на 15 кг, а Сяргей цяжэйшы за Радзіславу на 25 кг. На колькі кілаграмаў Сяргей цяжэйшы за Юру?

1



2



**11.** Па дарозе адно за адным ідуць 7 дзяцей. За кожным хлопчыкам, акрамя апошняга, ідзе дзяўчынка. Колькі дзяўчынак ідуць па дарозе?

Яна кажа:

Па дарозе ідуць 3 дзяўчынкі.

Ці праўду кажа Яна?

**1.** Вылічы. Выканай праверку адніманнем.
46 – 26 51 – 37 64 – 18 100 – 88

**2.** Усяго купілі 31 кг цыбулі і буракоў. Цыбулі купілі 13 кг. На колькі кілаграмаў менш купілі цыбулі, чым буракоў?



Правообладатель Национальный институт образования

# Урок 7

**1.** Растлумач, як Алесь і Яна вызначылі парадак дзеянняў у выразах.

① ② **30 + 5 – 1**

① ② **35 – 5 + 1**

② ① **59 – (2 + 7)**

② ① **50 + (13 – 7)**

**2.** Вызнач парадак дзеянняў. Прачытай выразы. Вылічы.

23 + 34 – 27 45 – 12 + 35 54 + 45 – 78

**3.** Вызнач парадак дзеянняў. Прачытай выразы. Вылічы.

56 – (13 + 12) 70 + (56 – 29) (24 + 45) – 16

78 – (47 – 36) 20 + (20 + 40) 64 – (39 – 9)

**4.** Запішы выразы і знайдзі іх значэнні.

- Да рознасці лікаў 62 і 35 дадаць 16.
- Ад сумы лікаў 47 і 30 адняць 54.
- Ад ліку 100 адняць суму лікаў 16 і 7.

**5.** Састаў выразы па схемах. Вылічы.







**6.** У кіёску было 42 батарэйкі. Прадалі 15 вялікіх батарэек і некалькі маленькіх. У кіёску засталося 17 батарэек. Колькі маленькіх батарэек было прададзена?



Правообладатель Национальный институт образования

**7.** Складзі і рашы задачы.







**8.** Дзеці пачалі выконваць дамашняе заданне ў 17 г, а закончылі праз 40 мін. Які гадзіннік паказвае той час, калі дзеці пачалі выконваць дамашняе заданне? Калі закончылі выконваць дамашняе заданне?



**9.** Ліза адзначыла на прамой запар 4 пункты на адлегласці 2 см адзін ад аднаго. Якая адлегласць ад першага пункта да апошняга?

**10.** Кірыл сарваў на 14 вішань больш, чым Ала. Кірыл даў Але 8 вішань. У каго з іх стала вішань больш і на колькі больш?

**1.** Запішы выразы і знайдзі іх значэнні.

- Да рознасці лікаў 37 і 22 дадаць лік 64.
- Ад ліку 100 адняць суму лікаў 79 і 11.

**2.** Для будаўніцтва дарогі ў першы дзень прывезлі 27 машын пяску, а ў другі — на 8 машын менш. Колькі ўсяго машын пяску прывезлі?



Правообладатель Национальный институт образования

# Урок 8

**1.** Растлумач, як Алесь саставіў роўнасці па малюнку.



**3 + 3 + 3 + 3 = 12**
**3 · 4 = 12**

**2.** Замяні складанне множаннем.

5 + 5 + 5 20 + 20 + 20 + 20 14 + 14

**3.** Замяні множанне складаннем. Вылічы.

5 · 3 12 · 4 30 · 2 15 · 5

**4.** Прачытай выразы, выкарыстоўваючы словы:

памножыць, множнікі, здабытак.

Вылічы.

2 · 6 8 · 3 9 · 2 3 · 5

**5.** Растлумач, як Яна саставіла роўнасці па малюнку.



**8 : 2 = 4**
**8 : 4 = 2**

**6.** Прачытай выразы, выкарыстоўваючы словы:

падзяліць, дзялімае, дзельнік, дзель.

Вылічы.

12 : 3 12 : 4 18 : 2 18 : 9

**7.** Дапоўні ўмову і рашы задачу.

У аднаго повара ? колы. Колькі колаў у шасці такіх повараў?



Правообладатель Национальный институт образования

**8.** Бабуля раздала 12 піражкоў унукам, па 3 піражкі кожнаму. Колькі ўнукаў у бабулі?

**9.** Дапоўні ўмову задачы адказам задачы 8. Складзі пытанне. Рашы задачу.
Бабуля раздала 8 піражкоў ? унукам, пароўну кожнаму.

**10.** Маса аўчаркі Мухтара — 35 кг. Мухтар на 20 кг цяжэйшы за пудзеля Андзі і на 15 кг лягчэйшы за сенбернара Дзіна. Якая маса Мухтара і Андзі разам?

**11.** У школе настаўнікі разам з дзецьмі хочуць зрабіць тры клумбы з кветкамі. Для таго каб абазначыць мяжу кожнай клумбы, ёсць тры скруткі вяроўкі, па 48 м у кожным. Ці хопіць вяроўкі ў скрутку, каб абазначыць мяжу клумбы?

1




2




3



Алесь кажа:
Для першай і другой клумб вяроўкі хопіць.

Яна кажа:
Для першай і трэцяй клумб вяроўкі хопіць.

Чыя праўда?

**1.** Вылічы.

| | | | |
|---|---|---|---|
| 3 · 4 | 2 · 9 | 10 : 2 | 10 : 5 |

**2.** У класе 8 сталоў. Колькі вучняў у класе, калі за кожным сталом сядзяць 2 вучні?



Правообладатель Национальный институт образования

# Урок 9

**1.** Растлумач, як Яна саставіла роўнасці па малюнку.

**3 · 5 = 15**
**5 · 3 = 15**

**2.** Параўнай.

2 · 3 ? 3 · 2 5 · 2 ? 2 + 5 2 · 12 ? 12 · 3
2 · 8 ? 8 · 2 4 + 3 ? 3 · 4 5 · 13 ? 14 · 5

**3.** Пабудуй схемы па ўзоры. Вылічы.

2 · 3 + 2 = 2 · 4 = 8

4 · 2 + 4
2 · 4 + 2

3 · 3 + 3
5 · 3 + 5

**4.** Пабудуй схемы па ўзоры. Вылічы.

2 · 4 – 2 = 2 · 3 = 6



2 · 3 – 2
3 · 5 – 3

6 · 2 – 6
3 · 3 – 3

**5.** Устаў прапушчаныя лікі так, каб няроўнасці былі правільныя. Колькі такіх лікаў?

7 · 3 < 23 – ? 16 : 2 > 5 + ? 2 · 5 > ? + 1

**6.** Складзі і рашы задачу. Складзі адваротныя задачы.

| Кубкаў у адным сервізе | Колькасць сервізаў | Кубкаў ва ўсіх сервізах |
|---|---|---|
| 6 | 3 | ? |

**7.** Стас сарваў 18 груш і падзяліў пароўну паміж сабой і двума сябрамі. Колькі груш атрымаў кожны?



Правообладатель Национальный институт образования

**8.** Тата паглядзеў па тэлевізары дакументальны фільм, перадачу «Навіны» і прагноз надвор'я. Фільм доўжыўся 27 мін, а «Навіны» — 25 мін. Колькі мінут доўжыўся прагноз надвор'я, калі тата глядзеў тэлевізар адну гадзіну?

**9.** Алесь і Яна рашалі задачу:
У танцы ўдзельнічаюць 4 пары дзяцей. У кожнай пары — хлопчык і дзяўчынка. Колькі дзяцей удзельнічаюць у танцы?

Алесь запісаў рашэнне з дапамогай складання і множання так:
$2 + 2 + 2 + 2 = 8$ $2 \cdot 4 = 8$

Яна запісала рашэнне з дапамогай складання і множання так:
$4 + 4 = 8$ $4 \cdot 2 = 8$

Чыя праўда?

**1.** Вылічы.

| | | | |
|---|---|---|---|
| $3 \cdot 6$ | $2 \cdot 8$ | $9 \cdot 3$ | $10 \cdot 2$ |
| $6 \cdot 3$ | $8 \cdot 2$ | $3 \cdot 9$ | $2 \cdot 10$ |

**2.** У парку павінны пасадзіць 90 ясеняў і бяроз. Пасадзілі ўжо 32 ясені і 25 бяроз. Колькі дрэў засталося пасадзіць?



Правообладатель Национальный институт образования

## Урок 10

**1.** Растлумач, як Алесь саставіў роўнасці па малюнку.



$$\frac{2 \cdot 9 = 18}{9 \cdot 2 = 18}$$

$18 : 2 = 9$

$18 : 9 = 2$

**2.** Які з трох лікаў з'яўляецца здабыткам двух іншых? Якія два лікі з трох — дзеллю?
Састаў роўнасці.

| | | |
|---|---|---|
| 2 | 8 | 4 |
| 18 | 6 | 3 |
| 3 | 9 | 27 |
| 5 | 10 | 2 |

**3.** Устаў прапушчаныя лікі, каб роўнасці былі правільныя.

$(52 + 4) + ? = 59$
$(37 - 2) - ? = 33$
$(99 - 5) - ? = 91$
$(76 + 3) - ? = 77$
$(64 + 3) + ? = 68$
$(8 + 6) + ? = 54$

**4.** Запішы выразы. Знайдзі іх значэнні.

- Да рознасці лікаў 65 і 60 дадаць 95.
- Ад ліку 43 адняць рознасць лікаў 20 і 7.
- Ад сумы лікаў 53 і 29 адняць 33.
- Да сумы лікаў 38 і 17 дадаць 45.

**5.** Складзі і рашы задачы.

| Маса аднаго пакета (кг) | Колькасць пакетаў (шт.) | Маса ўсіх пакетаў (кг) |
|---|---|---|
| 7 | 3 | ? |
| 7 | ? | 21 |
| ? | 3 | 21 |



Правообладатель Национальный институт образования

**6.** Пяцярым шчанятам далі па дзве костачкі і яшчэ тры костачкі далі шостаму шчаняці. Колькі костачак раздалі шчанятам?

**7.** Мама падзяліла 12 апельсінаў пароўну паміж сястрой і двума братамі. Колькі апельсінаў атрымала кожнае дзіця?

**8.** Даўжыня прамавугольніка — 17 см, а шырыня — на 2 см меншая. Знайдзі перыметр гэтага прамавугольніка.

**9.** Прачытай задачу. Разгледзь малюнак. Дапоўні задачу данымі малюнка. Рашы задачу.
Умяшчальнасць першага акварыума — ? л, другога — ? л і трэцяга — ? л. Ці хопіць 60 л вады, каб запоўніць гэтыя акварыумы?

**10.** У пакеце ляжаць 5 чырвоных і 3 зялёныя грушы. Колькі груш трэба дастаць з пакета з заплюшчанымі вачамі, каб сярод іх апынулася хаця б 1 чырвоная груша? Хаця б 1 зялёная груша?

**1.** Вылічы.

| | | | |
|---|---|---|---|
| 3 · 9 | 9 · 3 | 27 : 3 | 27 : 9 |

**2.** У дзвюх каробках па 6 алоўкаў, а ў трэцяй каробцы — 12 алоўкаў. Колькі ўсяго алоўкаў у гэтых каробках?



Правообладатель Национальный институт образования

# Урок 11

**1.** Састаў здабыткі і дзелі па ўзоры.

$2 \cdot 5 = 10$
$5 \cdot 2 = 10$
$10 : 2 = 5$
$10 : 5 = 2$

| • | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 2 | 4 | 6 | 8 | 10 | 12 | 14 | 16 | 18 |

**2.** Састаў выразы. Знайдзі іх значэнні.

Множнікі — 2 і 4.

Здабытак лікаў 7 і 2.

Дзель лікаў 4 і 2.

Дзялімае — 18, дзельнік — 9.

Множнікі — 6 і 2.

Дзель лікаў 16 і 8.

**3.** Вылічы.

$2 \cdot 8 - 2$ $\quad$ $2 \cdot 7 + 2$ $\quad$ $2 \cdot 9 - 9$

$2 \cdot 8 + 2$ $\quad$ $2 \cdot 7 - 2$ $\quad$ $2 \cdot 9 + 9$

**4.** Параўнай.

2 дм · 3 ? 2 дм · 2 $\quad$ 15 · 2 ? 14 + 14

6 мін · 2 ? 8 мін · 2 $\quad$ 10 + 10 ? 10 · 3

У якіх выпадках можна выканаць параўнанне без вылічэнняў?

**5.** Складзі і рашы задачу. Складзі адваротныя задачы.

| Кветак у адной вазе | Колькасць ваз | Усяго кветак |
|---|---|---|
| ? | 2 | 18 |

**6.** У заапарку было 85 звяроў і птушак. Звяроў было 56. У гэтым годзе ў заапарк прывезлі яшчэ 10 птушак. Колькі птушак стала ў заапарку?



Правообладатель Национальный институт образования

**7.** Складзі і рашы задачу.




**8.** Знайдзі перыметр кожнага многавугольніка.



**9.** Спачатку ў Алеся было вось на столькі грошай больш, чым у Яны:

Потым Яне далі яшчэ 5 рублёў. У каго цяпер грошай больш? На колькі рублёў больш?

Алесь кажа:

У мяне стала на 3 рублі больш, чым у Яны.

Ці праўду кажа Алесь?

**1.** Састаў выразы. Знайдзі іх значэнні.

Здабытак лікаў 2 і 3.

Множнікі — 2 і 4.

Дзялімае — 12, дзельнік — 2.

Дзель лікаў 12 і 6.

**2.** Знайдзі перыметр квадрата з даўжынёй стараны 2 дм.



Правообладатель Национальный институт образования

# Урок 12

**1.** Састаў здабыткі і дзелі па ўзоры.

$3 \cdot 4 = 12$
$4 \cdot 3 = 12$
$12 : 3 = 4$
$12 : 4 = 3$

| • | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 3 | 6 | 9 | 12 | 15 | 18 | 21 | 24 | 27 |

**2.** Знайдзі два лікі, здабытак якіх роўны:

6 12 15 24

**3.** Знайдзі два лікі, дзель якіх роўная:

6 4 9 3

**4.** Вылічы.

$3 \cdot 8 + 3$ $3 \cdot 6 - 3$ $3 \cdot 5 + 5$
$3 \cdot 8 - 3$ $3 \cdot 6 + 3$ $3 \cdot 5 - 5$

**5.** Знайдзі прапушчаныя лікі. Састаў здабыткі.

| Множнік | 9 | ? | 5 | ? | 4 | 7 |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Множнік | 3 | 8 | ? | 6 | 3 | ? |
| Здабытак | ? | 24 | 15 | 18 | ? | 21 |

**6.** Састаў выразы. Знайдзі іх значэнні.

- Да сумы лікаў 38 і 3 дадаць 17.
- Ад рознасці лікаў 58 і 29 адняць 0.
- Здабытак лікаў 2 і 5 павялічыць на 2.
- Ад здабытку лікаў 3 і 9 адняць 3.

**7.** Складзі і рашы задачу.






Правообладатель Национальный институт образования

**8.** Мама прыгатавала 5 слоікаў джэму. На кожны слоік пайшло па 1 шклянцы ягад малін і па 2 шклянкі ягад суніц. Колькі ўсяго шклянак ягад пайшло на ўвесь джэм?

**9.** У гадавальніку вырасцілі 65 кустоў чорнай парэчкі і 35 кустоў чырвонай. Калі некалькі кустоў парэчкі было прададзена, засталося 19 кустоў. Колькі кустоў парэчкі было прададзена?

**10.** Начарці ў сшытку два такія прамавугольнікі.



- Правядзі на першым прамавугольніку 2 адрэзкі так, каб атрымалася 4 трохвугольнікі.
- Правядзі на другім прамавугольніку 2 адрэзкі так, каб атрымалася 3 трохвугольнікі.

**11.** Ігар мые 6 талерак за той жа час, што і 8 кубкаў. Што ён мые хутчэй — талерку або кубак? Што ён вымые хутчэй — 5 талерак або 5 кубкаў?

**1.** Устаў прапушчаныя лікі, каб роўнасці былі правільныя.

$7 \cdot ? = 21$ $\qquad ? : 3 = 3$ $\qquad 24 : ? = 3$

**2.** Першакласнікі сабралі 40 кг макулатуры, а другакласнікі — на 7 кг менш. Вучні трэцяга класа сабралі на 12 кг макулатуры больш, чым другакласнікі. Колькі кілаграмаў макулатуры сабралі трэцякласнікі?



Правообладатель Национальный институт образования

# Урок 13

## Множанне і дзяленне



$4 \cdot 9 = 9 \cdot 4$

Растлумач і запомні.

$4 \cdot 4 = 16$
$4 \cdot 5 = 20$
$4 \cdot 6 = 24$
$4 \cdot 7 = 28$
$4 \cdot 8 = 32$
$4 \cdot 9 = 36$

$5 \cdot 4 = 20$
$6 \cdot 4 = 24$
$7 \cdot 4 = 28$
$8 \cdot 4 = 32$
$9 \cdot 4 = 36$

**1.** Састаў выразы. Знайдзі іх значэнні.

| Множнік | 8 | 4 | 4 | 7 | 4 | 6 |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Множнік | 4 | 5 | 9 | 4 | 4 | 4 |

**2.** Вылічы.

$4 \cdot 5 + 4$ $\quad$ $4 \cdot 7 + 4$ $\quad$ $4 \cdot 9 + 4$
$4 \cdot 5 - 4$ $\quad$ $4 \cdot 7 - 4$ $\quad$ $4 \cdot 9 - 4$

**3.** Вылічы.

58 см + 12 см – 34 см $\quad$ 8 см · 4 + 8 см
10 дм – 56 см + 42 см $\quad$ 4 см · 9 – 4 см

**4.** У адной каробцы 8 рулетаў з разынкамі. Колькі рулетаў у чатырох такіх каробках?

Як змяніць лікі ў задачы так, каб адказ стаў меншым?

Правообладатель Национальный институт образования

**5.** Параўнай задачы. Выберы схему да кожнай задачы. Рашы задачы.

- У каробцы было 25 жоўтых, зялёных і чырвоных гузікаў. Колькі гузікаў узялі з каробкі, калі ў ёй засталося 13 жоўтых і 2 зялёныя гузікі?
- У каробцы было 25 жоўтых, зялёных і чырвоных гузікаў. Колькі гузікаў засталося ў каробцы, калі з яе ўзялі 13 жоўтых і 2 зялёныя гузікі?

1




2




**6.** Для свята Зося зрабіла на 15 выцінанак больш, чым Алеся. Потым Алеся зрабіла яшчэ 20 выцінанак. У каго стала выцінанак больш? На колькі больш?

**7.** Выберы выраз, з дапамогай якога можна вылічыць даўжыню ломанай. Знайдзі даўжыню ломанай.

| | | | |
|---|---|---|---|
| 2 · 3 + 3 | 2 · 4 + 3 | 2 · 5 + 2 | 2 · 4 + 2 |

Прылічвай па чатыры ад ліку чатыры да ліку сорак.

**1.** Вылічы.

4 · 9 4 · 8 7 · 4 5 · 4

**2.** На выставе трэба ўстанавіць 100 вітрын. У першы дзень устанавілі 47 вітрын, а ў другі — 34. Колькі вітрын засталося ўстанавіць?



Правообладатель Национальный институт образования

# Урок 14



$4 \cdot 5 = 20$
$20 : 4 = ?$
$20 : 5 = ?$

Растлумач і запомні.

$4 \cdot 4 = 16$
$4 \cdot 5 = 20$
$4 \cdot 6 = 24$
$4 \cdot 7 = 28$
$4 \cdot 8 = 32$
$4 \cdot 9 = 36$

$16 : 4 = 4$
$20 : 4 = 5$
$24 : 4 = 6$
$28 : 4 = 7$
$32 : 4 = 8$
$36 : 4 = 9$

$20 : 5 = 4$
$24 : 6 = 4$
$28 : 7 = 4$
$32 : 8 = 4$
$36 : 9 = 4$

**1.** Састаў выразы. Знайдзі іх значэнні.

| Дзялімае | 20 | 32 | 36 | 28 | 16 | 24 |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Дзельнік | 4 | 8 | 4 | 7 | 4 | 6 |

**2.** Вылічы.

| | | |
|---|---|---|
| $6 \cdot 4$ | $9 \cdot 4$ | $70 - (20 - 8)$ |
| $24 : 4$ | $36 : 4$ | $(50 - 43) + 76$ |
| $24 : 6$ | $36 : 9$ | $100 - 48 + 17$ |

**3.** Вылічы ў слупок.

| | | |
|---|---|---|
| $27 + 64$ | $83 - 29$ | $19 + 53 + 25$ |
| $36 + 44$ | $51 - 17$ | $37 + 16 + 47$ |

**4.** Андрэй падзяліў 36 арэхаў па 4 арэхі паміж сабой і сваімі сябрамі. Колькі сяброў Андрэя атрымалі арэхі?



Правообладатель Национальный институт образования

**5.** Складзі і рашы задачу. Складзі адваротныя задачы.

| Маса аднаго кавуна (кг) | Колькасць кавуноў (шт.) | Маса ўсіх кавуноў (кг) |
|---|---|---|
| ? | 4 | 24 |

**6.** Выберы схему. Рашы задачу.
У аўтобусе ехалі 47 пасажыраў. На першых трох прыпынках выйшлі па 4 пасажыры. Колькі пасажыраў засталося ў аўтобусе, калі ён быў у дарозе 24 мін?

1




2




**7.** Выразі ў мінутах.

1 г 15 мін | 1 г 30 мін | 1 г 40 мін | 1 г 23 мін

Выразі ў гадзінах і мінутах.

70 мін | 80 мін | 95 мін | 66 мін

Адлічвай па чатыры, пачынаючы ад ліку сорак.

**1.** Вылічы.

| | | | |
|---|---|---|---|
| 4 · 8 | 5 · 4 | 4 · 7 | 9 · 4 |
| 32 : 4 | 20 : 5 | 28 : 4 | 36 : 9 |

**2.** У бочцы было 97 л квасу. Да абеду прадалі 39 л квасу. На колькі менш літраў квасу прадалі, чым засталося?



Правообладатель Национальный институт образования

# Урок 15

На паліцы 3 кубкі, а шклянак — у 2 разы больш. Колькі шклянак на паліцы?

Кубкаў — 3.
Шклянак — ?, у 2 разы больш.



**1.** Выберы схему да кожнай задачы. Рашы задачы.

- Галя купіла 5 заколак, а Вольга — **на 3** заколкі больш. Колькі заколак купіла Вольга?
- Галя купіла 5 заколак, а Вольга — **у 3 разы** больш. Колькі заколак купіла Вольга?

1




2




**2.** Састаў выразы. Знайдзі іх значэнні.

- Лік 4 павялічыць у 5 разоў.
- Лік 8 павялічыць у 3 разы.
- Здабытак лікаў 9 і 4 павялічыць на 9.
- Ад здабытку лікаў 3 і 6 адняць 3.

**3.** Параўнай.

$3 \cdot 8 + 3 \;?\; 3 \cdot 9$
$4 \cdot 9 - 4 \;?\; 4 \cdot 8$
$5 \cdot 4 + 5 \;?\; 7 \cdot 4$

$8 \text{ см} \cdot 2 \;?\; 7 \text{ см} \cdot 3$
$9 \text{ дм} \cdot 3 \;?\; 6 \text{ дм} \cdot 4$
$4 \text{ кг} \cdot 7 \;?\; 4 \text{ кг} \cdot 5$

У якіх выпадках можна выканаць параўнанне без вылічэнняў?

Правообладатель Национальный институт образования

**4.** Устаў прапушчаныя знакі дзеянняў, каб роўнасці былі правільныя.

| | | |
|---|---|---|
| 24 ? 4 = 20 | 32 ? 8 = 4 | 27 ? 9 = 3 |
| 24 ? 4 = 6 | 32 ? 8 = 40 | 27 ? 9 = 18 |

**5.** Вылічы.

| | | |
|---|---|---|
| 44 + 16 + 12 | 15 + 36 + 25 | 18 + 31 + 12 + 19 |
| 52 + 28 + 9 | 27 + 49 + 13 | 14 + 32 + 16 + 18 |

**6.** У час адпачынку на Нарачы Міхаліна зрабіла 35 малюнкаў, што на 12 малюнкаў больш, чым зрабіў яе брат. Колькі ўсяго малюнкаў зрабілі дзеці?

**7.** У пляжны валейбол гулялі 2 хлопчыкі і столькі ж дзяўчынак. Балельшчыкаў было на 29 больш, чым ігракоў. Колькі было балельшчыкаў?

**8.** Начарці ломаную, даўжыню якой можна вылічыць так:

3 см · 2 + 3 см

**9.** Начарці ломаную з пяці звёнаў, даўжыня якой у 2 разы большая за даўжыню ломанай з задачы 8.

Прачытай выразы, выкарыстоўваючы слова «павялічыць».

8 · 4 3 · 5

**1.** Вылічы.

| | | | |
|---|---|---|---|
| 28 : 7 | 36 : 4 | 8 · 4 | 20 : 5 |

**2.** У збане было 2 л вады, а ў вядры — у 5 разоў больш. Колькі літраў вады было ў вядры?



Правообладатель Национальный институт образования

# Урок 16

Было 6 маленькіх ракетак, а вялікіх — у 2 разы менш. Колькі было вялікіх ракетак?



Маленькіх — 6.
Вялікіх — ?, у 2 разы менш.



**1.** Выберы схему да кожнай задачы. Рашы задачы.

- У гуртку робататэхнікі 9 хлопчыкаў, а дзяўчынак — **на 3** менш. Колькі дзяўчынак у гуртку?
- У гуртку робататэхнікі 9 хлопчыкаў, а дзяўчынак — **у 3 разы** менш. Колькі дзяўчынак у гуртку?

1




2




**2.** Сыну 6 гадоў. Колькі гадоў маме, калі яна ў 4 разы старэйшая за сына?

**3.** Састаў выразы. Знайдзі іх значэнні.

Паменшы ў 3 разы.

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| ? | ? | ? | ? | ? |
| 27 | 24 | 18 | 15 | 12 |
| ? | ? | ? | ? | ? |

Паменшы на 3.



Правообладатель Национальный институт образования

**4.** Састаў выразы. Знайдзі іх значэнні.
- Дзель лікаў 16 і 4.
- Здабытак лікаў 3 і 8.
- Дзель лікаў 24 і 6.
- Здабытак лікаў 4 і 2.
- Лік 36 паменшыць у 9 разоў.
- Лік 24 паменшыць у 8 разоў.

**5.** На колькі адзін лік большы або меншы за другі?

| | | |
|---|---|---|
| 99 і 48 | 24 і 70 | 82 і 29 |
| 12 і 45 | 28 і 16 | 42 і 100 |

**6.** На выставе сабак было 25 лабрадораў. З іх — 7 чорных, а астатнія — карычневыя. На колькі больш было карычневых лабрадораў, чым чорных?

**7.** Рашы задачы.
- Знайдзі перыметр квадрата, даўжыня стараны якога роўная 7 см.
- Знайдзі даўжыню стараны квадрата, перыметр якога роўны 32 см.

Прачытай выразы, выкарыстоўваючы слова «паменшыць».

27 : 9 36 : 4

**1.** Устаў прапушчаныя лікі, каб роўнасці былі правільныя.

4 · ? = 36 ? · 7 = 21

24 : ? = 8 ? : 3 = 6

**2.** Купілі 20 сшыткаў у клетку, а сшыткаў у лінейку — у 4 разы менш. Колькі сшыткаў у лінейку купілі?



Правообладатель Национальный институт образования

# Урок 17

**1.** Знайдзі прапушчаныя лікі. Састаў дзелі.

| Дзялімае | 12 | 20 | 27 | 32 | ? | ? |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Дзельнік | ? | 5 | 9 | ? | 9 | 4 |
| Дзель | 3 | ? | ? | 4 | 4 | 6 |

**2.** Паменшы лікі ў 4 разы.

8 16 24 20 28

Павяліч лікі ў 3 разы.

4 8 3 5 9

**3.** Знайдзі заканамернасць. Устаў прапушчаныя лікі.

2 → 4 4 → 8 6 → ? 8 → ? 10 → ?

27 → 9 24 → 8 21 → ? 18 → ? 15 → ?

**4.** Параўнай.

4 · 5 ? 4 · 4 + 4 3 · 9 – 3 ? 3 · 7

4 · 8 ? 4 · 9 – 4 2 · 5 + 2 ? 2 · 8

**5.** Устаў прапушчаныя лікі, каб роўнасці былі правільныя.

20 : ? = 5 37 + ? = 81 ? – 22 = 45 + 19

? · 3 = 24 63 – ? = 49 ? + 51 = 93 – 14

**6.** Шырыня прамавугольніка — 4 дм, а даўжыня — у 4 разы большая. Знайдзі даўжыню гэтага прамавугольніка.

Ці можна падзяліць гэты прамавугольнік на 4 аднолькавыя квадраты? На 2 аднолькавыя квадраты?

Правообладатель Национальный институт образования

**7.** Рашы задачы.

- Казіміру 18 гадоў. Колькі гадоў яго сястры, калі яна ў 3 разы маладзейшая за яго?
- Стасі 7 гадоў. Колькі гадоў яе маме, калі яна ў 4 разы старэйшая за дачку?

**8.** Дапоўні ўмову задачы па схеме. Рашы задачу.
У Глеба ў кантактах тэлефона ёсць ? нумароў. З іх — ? нумароў аднакласнікаў, ? нумароў сяброў з летняга лагера адпачынку. Астатнія кантакты — гэта нумары членаў сям'і Глеба. Колькі нумароў членаў сям'і запісана ў Глеба ў тэлефоне?




**9.** Яна сфатаграфавала каўпачок зверху. Выберыце фотаздымак, які мог атрымацца.




**1.** Вылічы.

14 : 7 24 : 6 4 · 8 2 · 4

**2.** Даўжыня першага адрэзка — 18 см, а даўжыня другога адрэзка — у 6 разоў меншая. Знайдзі даўжыню другога адрэзка. Начарці гэты адрэзак.



Правообладатель Национальный институт образования

# Урок 18



$5 \cdot 9 = 9 \cdot 5$

Растлумач і запомні.

$5 \cdot 5 = 25$
$5 \cdot 6 = 30$
$5 \cdot 7 = 35$
$5 \cdot 8 = 40$
$5 \cdot 9 = 45$

$6 \cdot 5 = 30$
$7 \cdot 5 = 35$
$8 \cdot 5 = 40$
$9 \cdot 5 = 45$

**1.** Састаў выразы. Знайдзі іх значэнні.

Павяліч у 5 разоў.

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| ? | ? | ? | ? | ? |
| 9 | 7 | 8 | 5 | 6 |
| ? | ? | ? | ? | ? |

Павяліч на 5.

**2.** Знайдзі значэнні выразаў.

$5 \cdot 8 + 5$ $\quad$ $5 \cdot 9 + 5$ $\quad$ $5 \cdot 7 + 7$
$5 \cdot 8 - 5$ $\quad$ $5 \cdot 9 - 5$ $\quad$ $6 \cdot 5 - 5$

**3.** Выпішы ў парадку павелічэння.

5 см $\quad$ 5 дм $\quad$ 20 см $\quad$ 63 см $\quad$ 1 м $\quad$ 1 дм

**4.** Колькі дзён правёў Юра на канікулах у бабулі, калі ён быў там 5 тыдняў і яшчэ 5 дзён? Ці правільна, што Юра гасціў у бабулі больш за месяц?



Правообладатель Национальный институт образования

**5.** На талерцы 5 персікаў, а сліў — у 3 разы больш. Колькі на талерцы сліў?

**6.** Параўнай гэту задачу з задачай 5 і рашы яе.
На талерцы 5 персікаў. Гэта ў 3 разы менш, чым сліў. Колькі на талерцы сліў?



- Персікаў у 3 разы менш, чым сліў.
- Значыць, сліў у 3 разы больш, чым персікаў.

**7.** З градкі сабралі 8 кг агуркоў. Гэта ў 5 разоў менш, чым сабралі кабачкоў. Колькі кілаграмаў кабачкоў сабралі?

**8.** Тэрэзе 5 гадоў. Тата ў 6 разоў старэйшы за Тэрэзу і на 3 гады старэйшы за маму. Колькі гадоў маме?

Прылічвай па пяць ад ліку пяць да ліку пяцьдзясят.

**1.** Устаў прапушчаныя лікі, каб роўнасці былі правільныя.

$5 \cdot ? = 35$ $\quad ? \cdot 6 = 30$

$20 : ? = 5$ $\quad ? \cdot 8 = 40$

**2.** У першым наборы 6 фламастараў. Гэта ў 5 разоў менш, чым у другім наборы. Колькі фламастараў у другім наборы?



Правообладатель Национальный институт образования

# Урок 19



$5 \cdot 6 = 30$

$30 : 5 = ?$

$30 : 6 = ?$

Растлумач і запомні.

$5 \cdot 5 = 25$
$5 \cdot 6 = 30$
$5 \cdot 7 = 35$
$5 \cdot 8 = 40$
$5 \cdot 9 = 45$

$25 : 5 = 5$
$30 : 5 = 6$
$35 : 5 = 7$
$40 : 5 = 8$
$45 : 5 = 9$

$30 : 6 = 5$
$35 : 7 = 5$
$40 : 8 = 5$
$45 : 9 = 5$

**1.** Знайдзі прапушчаныя лікі. Састаў дзелі.

| Дзялімае | 45 | 35 | ? | 25 | 40 | ? |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Дзельнік | ? | 7 | 5 | ? | 8 | 4 |
| Дзель | 9 | ? | 6 | 5 | ? | 5 |

**2.** Знайдзі значэнні выразаў.

| | | | |
|---|---|---|---|
| $40 : 5$ | $30 : 6$ | $36 : 4$ | $27 : 9$ |
| $45 : 5$ | $25 : 5$ | $32 : 8$ | $15 : 3$ |

**3.** Вылічы.

| | | | |
|---|---|---|---|
| $4 \cdot 5 + 4$ | $9 \cdot 5 - 9$ | $5 \cdot 6 + 6$ | $8 \cdot 5 - 5$ |

**4.** На малюнку паказана, а якой гадзіне Вацлаў прыйшоў дадому. Яму трэба 20 мін, каб паабедаць. Мультфільм пачнецца ў 13 г 40 мін. Ці паспее Вацлаў паабедаць да пачатку мультфільма?






Правообладатель Национальный институт образования

**5.** Купілі 12 табурэтак, а крэсел — у 3 разы менш. Колькі купілі крэсел?

**6.** Параўнай гэту задачу з задачай 5 і рашы яе.
Купілі 12 табурэтак. Табурэтак купілі ў 3 разы больш, чым крэсел. Колькі купілі крэсел?



- Табурэтак у 3 разы больш, чым крэсел.
- Значыць, крэсел у 3 разы менш, чым табурэтак.

**7.** Кузьме 8 гадоў. Ён у 2 разы старэйшы за свайго брата Івана. Колькі гадоў Івану?

**8.** Дзяніс рашыў задачу за 5 мін. Ён патраціў у 2 разы менш часу, чым Алег. Колькі мінут рашаў задачу Віця, калі яму спатрэбілася на 4 мін больш, чым Алегу?

Адлічвай па пяць, пачынаючы ад ліку пяцьдзясят.

**1.** Састаў выразы і знайдзі іх значэнні.

- Паменшы лікі ў 5 разоў: 30 ; 40 ; 20 .
- Павяліч лікі ў 4 разы: 5 ; 7 ; 9 .

**2.** Бора зняў відэакліп пра сабаку Палкана, які доўжыўся 9 мін. Гэта ў 3 разы больш, чым відэакліп пра ката Рыжыка. Колькі мінут доўжыўся відэакліп пра Рыжыка?



Правообладатель Национальный институт образования

# Урок 20



$6 \cdot 8 = 48$
$8 \cdot 6 = ?$
$48 : 6 = ?$
$48 : 8 = ?$

Растлумач і запомні.

$6 \cdot 6 = 36$
$6 \cdot 7 = 42$
$6 \cdot 8 = 48$
$6 \cdot 9 = 54$

$7 \cdot 6 = 42$
$8 \cdot 6 = 48$
$9 \cdot 6 = 54$

$36 : 6 = 6$
$42 : 6 = 7$
$48 : 6 = 8$
$54 : 6 = 9$

$42 : 7 = 6$
$48 : 8 = 6$
$54 : 9 = 6$

**1.** Састаў выразы, з дапамогай якіх можна знайсці прапушчаныя лікі. Знайдзі значэнні гэтых выразаў.

| Множнік | 7 | ? | 6 | ? | 6 | 5 |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Множнік | 6 | 8 | ? | 6 | 4 | ? |
| Здабытак | ? | 48 | 54 | 36 | ? | 30 |

**2.** Вылічы.

7 см · 6 6 см · 8 36 дм : 9 54 дм : 6

**3.** Устаў прапушчаныя знакі дзеянняў, каб роўнасці былі правільныя.

53 ? 22 ? 18 = 57 31 ? 11 ? 20 = 40

**4.** Выразі ў мінутах.

1 г 25 мін | 1 г 39 мін | 1 г 12 мін | 1 г 8 мін



Правообладатель Национальный институт образования

**5.** Складзі і рашы задачу. Складзі адваротныя задачы.

| Кішэней на адной сукенцы | Колькасць сукенак | Кішэней на ўсіх сукенках |
|---|---|---|
| 4 | 6 | ? |

**6.** Купілі 40 білетаў у цырк для двух класаў. У адным класе 20 вучняў, што на 3 вучні больш, чым у другім класе. Ці хопіць купленых білетаў для двух класаў?

**7.** Майстар робіць за змену 54 дэталі, што ў 6 разоў больш, чым робіць вучань. Колькі дэталей яны робяць за змену разам?

**8.**
Рома і Лёша — браты. Рома сказаў, што ў яго дзве сястры, і Лёша сказаў, што ў яго дзве сястры. У кожнага дзіцяці ў сям'і ёсць па 2 рублі. Колькі грошай ва ўсіх дзяцей у сям'і Ромы і Лёшы?

Яна кажа:
Ва ўсіх дзяцей у сям'і 8 рублёў.

Алесь кажа:
Ва ўсіх дзяцей у сям'і 12 рублёў.

Чыя праўда?

Знайдзі заканамернасць і прадоўжы называць лікі.

60 54 48 ? ? ?

**1.** Устаў прапушчаныя лікі, каб роўнасці былі правільныя.

$9 \cdot ? = 54$ $36 : ? = 6$

$? : 8 = 6$ $7 \cdot ? = 42$

**2.** Паўлу 5 гадоў. Павел у 3 разы маладзейшы за Вову. Косця на 6 гадоў маладзейшы за Вову. Колькі гадоў Косцю?



Правообладатель Национальный институт образования

# Урок 21

На арэне цырка 6 тыграў і 2 львы. У колькі разоў тыграў больш, чым ільвоў? У колькі разоў ільвоў менш, чым тыграў?

Тыграў — 6.
Ільвоў — 2.
У колькі разоў?



- Каб даведацца, у колькі разоў адзін лік большы або меншы за другі, трэба большы лік падзяліць на меншы.

**1.** Даўжыня агарода прамавугольнай формы — 12 м, а яго шырыня — 4 м. У колькі разоў даўжыня агарода большая за яго шырыню?

**2.** У колькі разоў адзін лік большы або меншы за другі? Састаў дзелі.

**3.** Вылічы.

6 · 7 + 6 8 · 6 – 8 6 · 9 + 9 5 · 8 – 8

**4.** Устаў прапушчаныя лічбы.






Правообладатель Национальный институт образования

**5.** Выкарыстоўваючы лікі ад 2 да 9, састаў усе правільныя няроўнасці.

$6 \cdot ? < 36$ $\quad ? \cdot 5 > 25$ $\quad 24 > 4 \cdot ?$

**6.** У кожнай легкавой машыны 4 колы і адно запасное кола. Колькі ўсяго колаў у дзевяці машын?

**7.** У табліцы паказана, колькі новых англійскіх слоў Багдан вывучыў за кожны дзень тыдня. Колькі ўсяго новых англійскіх слоў вывучыў Багдан за тыдзень?

| ПН | АЎТ | СР | ЧЦ | ПТ | СБ | НДЗ |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | |
| | | | | | | |
| | | | | | | |
| | | | | | | |

Больш або менш слоў вывучыць Багдан за тыдзень, калі ён будзе вучыць у панядзелак, сераду і нядзелю на 1 слова менш, а ў астатнія дні тыдня — на 1 слова больш?

У колькі разоў 8 больш, чым 2? Менш, чым 32?

**1.** Састаў выразы. Знайдзі іх значэнні.

- Здабытак лікаў 6 і 6 паменшыць на 6.
- Ад здабытку лікаў 4 і 6 адняць 4.

**2.** Умяшчальнасць бочкі — 35 л, а вядра — 7 л. У колькі разоў умяшчальнасць бочкі большая за ўмяшчальнасць вядра?



Правообладатель Национальный институт образования

# Урок 22

**1.** Знайдзі заканамернасць і прадоўжы рад лікаў.

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 54 | 48 | 42 | 36 | ? | ? | ? | ? | ? |
| 5 | 10 | 15 | 20 | ? | ? | ? | ? | ? |

**2.** Які з трох лікаў з'яўляецца здабыткам двух іншых? Якія два лікі з трох — дзеллю? Састаў роўнасці.

**3.** Устаў прапушчаныя лікі, каб роўнасці былі правільныя.

? – 25 = 42 : 7 54 : 9 = 36 – ?

? + 12 = 6 · 4 8 · 5 = 30 + ?

**4.** Адкажы на пытанні.

- У колькі разоў дзель лікаў 48 і 8 меншая за здабытак лікаў 2 і 6?
- У колькі разоў сума лікаў 16 і 24 большая за рознасць лікаў 50 і 42?

**5.** Маса казляняці — 15 кг, а маса парасяці — 3 кг. У колькі разоў парася лягчэйшае за казляня?

**6.** Параўнай і рашы задачы.

- Дзецям раздалі 54 алоўкі, па 6 алоўкаў кожнаму. Колькі дзяцей атрымалі алоўкі?
- У кожнага дзіцяці было па 6 алоўкаў, а ўсяго алоўкаў — 54. Колькі было дзяцей?

**7.** Было 47 м тканіны. З 20 м тканіны пашылі сукенкі, а з астатняй тканіны — 9 аднолькавых кашуль. Колькі метраў тканіны пайшло на кожную кашулю?



Правообладатель Национальный институт образования

**8.** У чэрвені 6 дзён ішоў дождж, а ў астатнія дні свяціла сонца. Дажджлівых дзён у чэрвені было ў 4 разы менш, чым сонечных. Колькі ўсяго дзён у чэрвені?

**9.** Растлумач выразы. Якія выразы лішнія?
Знайшлі 12 баравікоў, 24 чырвонагаловікі, рыжыкаў — у 4 разы менш, чым чырвонагаловікаў, а падбярозавікаў — на 4 менш, чым баравікоў.

12 + 24 | 24 : 4 | 12 + 4 | 12 – 4 | 12 : 4 | 24 – 12 | 24 : 12

**10.** Складзі і рашы задачы.




**11.** Паўгадзіны — гэта палова гадзіны. Падумайце, колькі ў адной гадзіне палоў гадзіны, і рашыце задачу. Кожныя паўгадзіны на будоўлю прывозяць 6 машын пяску. Колькі машын пяску прывязуць на будоўлю за 3 гадзіны?

**1.** Вылічы.
6 см · 9 | 8 дм · 6 | 36 кг : 6 | 42 дм : 7

**2.** У Мацвея 12 кніг пра звяроў. Гэта ў 2 разы больш, чым кніг пра падарожжы. Колькі ўсяго кніг пра звяроў і пра падарожжы ў Мацвея?



Правообладатель Национальный институт образования

# Урок 23



$7 \cdot 9 = 63$
$9 \cdot 7 = ?$
$63 : 7 = ?$
$63 : 9 = ?$

Растлумач і запомні.

$7 \cdot 7 = 49$
$7 \cdot 8 = 56$
$7 \cdot 9 = 63$

$8 \cdot 7 = 56$
$9 \cdot 7 = 63$

$49 : 7 = 7$
$56 : 7 = 8$
$63 : 7 = 9$

$56 : 8 = 7$
$63 : 9 = 7$

**1.** Знайдзі заканамернасць і прадоўжы рад лікаў.

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 63 | 56 | 49 | 42 | ? | ? | ? | ? | ? |
| 7 | 14 | 21 | 28 | ? | ? | ? | ? | ? |

**2.** Вылічы.

| | | |
|---|---|---|
| $7 \cdot 6 + 7$ | $7 \cdot 8 + 7$ | $7 \cdot 9 + 9$ |
| $7 \cdot 6 - 7$ | $7 \cdot 8 - 7$ | $7 \cdot 9 - 9$ |

**3.** Састаў выразы. Знайдзі іх значэнні.

- Лік 49 паменшыць у 7 разоў.
- Лік 4 павялічыць у 8 разоў.
- Дзель лікаў 63 і 7.
- Здабытак лікаў 5 і 7.

**4.** Вылічы.

$(19 + 41) + 31$ $\quad$ $61 - (42 - 17)$ $\quad$ $80 - (25 + 36)$

**5.** У па́церках Антаніны 7 чырвоных пацерачак. Гэта ў 3 разы менш, чым жоўтых. Колькі ўсяго пацерачак у пацерках Антаніны?



Правообладатель Национальный институт образования

**6.** Выберы схему. Рашы задачу.
Па некалькі пірожных ляжыць у 4 каробках, пароўну ў кожнай. Усяго ў каробках 24 пірожныя. Колькі пірожных у кожным наборы?




**7.** У магазіне прадалі 7 чайных сервізаў, па 6 кубкаў у кожным, і яшчэ 8 кубкаў і 10 шклянак. Колькі ўсяго кубкаў прадалі?

**8.** Складзі задачы, якія рашаюцца так:

3 + 9 | 3 · 9 | 9 – 3 | 9 : 3

**9.** Назаві фігуры, перыметры якіх роўныя 8 см.



Прылічвай па сем ад ліку сем да ліку семдзесят.

**1.** Параўнай.

2 · 7 ? 3 · 7
7 · 9 ? 7 · 7
49 : 7 ? 42 : 7
56 : 7 ? 45 : 5

**2.** Даўжыня адрэзка — 7 см. Даўжыня гэтага адрэзка на 42 см меншая, чым даўжыня ломанай. У колькі разоў адрэзак карацейшы за ломаную?



Правообладатель Национальный институт образования

# Урок 24

Растлумач і запомні.

| | | | |
|---|---|---|---|
| 8 · 8 = 64<br>8 · 9 = 72 | 9 · 8 = 72 | 64 : 8 = 8<br>72 : 8 = 9 | 72 : 9 = 8 |
| 9 · 9 = 81 | | 81 : 9 = 9 | |

**1.** Састаў выразы. Знайдзі іх значэнні.

Павяліч у 9 разоў.

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| ? | ? | ? | ? | ? |
| 9 | 7 | 5 | 6 | 8 |
| ? | ? | ? | ? | ? |

Павяліч на 9.

**2.** Састаў роўнасці.




**3.** Вылічы і выканай праверку.

63 – 29 28 + 57 31 + 69 100 – 48

**4.** Параўнай і рашы задачы.

- На адным пралёце лесвіцы 9 прыступак. Гэта ў 8 разоў менш, чым прыступак на ўсёй лесвіцы. Колькі прыступак на ўсёй лесвіцы?
- На адным пралёце лесвіцы 9 прыступак, а на ўсёй лесвіцы — у 8 разоў больш. Колькі прыступак на ўсёй лесвіцы?



Правообладатель Национальный институт образования

**5.** Купілі 30 кг сухога корму для сабакі і кошкі. Праз месяц засталося 12 кг корму для сабакі і 7 кг корму для кошкі. Колькі кілаграмаў сухога корму з'елі сабака і кошка за месяц?

**6.** Усю ваду разлілі ў 5 вёдзер. У кожным вядры аказалася па 6 л вады. Колькі літраў вады было?

**7.** Ці хопіць агароджы даўжынёй 40 м для ўчастка квадратнай формы з даўжынёй стараны 8 м?

**8.** Каб добра адпачыць, чалавек павінен спаць ноччу не менш за 8 г. Алег заснуў у 22 г 10 мін і праспаў не менш за 8 г. На якім гадзінніку паказана, а якой гадзіне Алег заснуў? На якім — калі ён мог прачнуцца?



Прылічвай па восем ад ліку восем да ліку восемдзесят. Адлічвай па дзевяць ад ліку дзевяноста.

**1.** Вылічы.

$8 \cdot 9$ $\quad 9 \cdot 9$ $\quad 72 : 9$ $\quad 45 : 9$

**2.** Будаўнікі працавалі на адной будоўлі 9 дзён. Гэта ў 7 разоў менш за той час, які яны прапрацавалі на другой будоўлі. Колькі дзён працавалі будаўнікі на гэтых дзвюх будоўлях?



Правообладатель Национальный институт образования

# Урок 25

Калі ў выразе НЯМА ДУЖАК і ён утрымлівае толькі **множанне** і **дзяленне**, то дзеянні выконваюць па парадку злева направа.

$$\overset{①}{6} : \overset{②}{2} \cdot 5$$

**1.** Вызнач парадак выканання дзеянняў і знайдзі значэнні выразаў.

| | | | |
|---|---|---|---|
| 21 : 7 · 4 | 6 · 4 : 8 | 63 : 7 : 3 | 2 · 4 · 9 |
| 64 : 8 · 5 | 3 · 2 · 9 | 56 : 7 : 2 | 6 · 6 : 9 |

**2.** Параўнай.

| | |
|---|---|
| 72 : 9 · 5 ? 72 – 9 + 5 | 40 + 20 + 20 ? 4 · 2 · 2 |
| 54 : 6 : 3 ? 54 – 6 – 3 | 20 + 60 – 40 ? 2 · 6 : 4 |

**3.** Устаў прапушчаныя лікі, каб роўнасці былі правільныя.

| | | |
|---|---|---|
| 38 + ? = 100 | 7 · ? = 56 | ? · 5 = 40 |
| ? + 14 = 100 | 48 : ? = 8 | ? : 9 = 9 |

**4.** Вылічы.

| | | |
|---|---|---|
| 51 см – 32 см | 24 см + 68 см | 2 дм · 2 |
| 51 см – 28 см | 20 см + 72 см | 4 дм · 4 |
| 51 см – 24 см | 16 см + 76 см | 6 дм · 6 |

**5.** Прачытай задачу. Разгледзь схему. Запішы рашэнне задачы па дзеяннях.

На дзень нараджэння Мірону падарылі 5 набораў салдацікаў, па 2 штукі ў кожным, і 4 наборы, па 3 штукі ў кожным. Колькі ўсяго салдацікаў падарылі Мірону?






Правообладатель Национальный институт образования

**6.** Складзі і рашы задачу.

| | Гузікаў на адным вырабе | Колькасць вырабаў | Гузікаў на ўсіх вырабах |
|---|---|---|---|
| Сукенкі | 4 | 5 | ? |
| Кашулі | 8 | 7 | ? |

?

**7.** Для ўдзелу ў спаборніцтвах 72 вучні разбіліся на некалькі аднолькавых каманд. У кожнай камандзе аказалася па 9 вучняў. Колькі атрымалася каманд?

**8.** У майстэрні адрамантавалі 56 планшэтаў і 7 камп'ютараў. У колькі разоў больш планшэтаў, чым камп'ютараў, адрамантавалі?

**9.** У першым, другім, трэцім і чацвёртым дамах па 9 пад'ездаў. Колькі пад'ездаў у пятым доме, калі ўсяго ў гэтых дамах 46 пад'ездаў?

Як змяніць лікі ў задачы так, каб адказ атрымаўся большым?

Вызнач парадак выканання дзеянняў і вылічы.

8 · 3 : 4 72 : 8 · 3

**1.** Пакажы парадак выканання дзеянняў і знайдзі значэнні выразаў.

2 · 4 · 7 2 · 9 : 6 24 : 6 : 2

**2.** У паходзе ў трох байдарках плылі па 6 турыстаў, а ў пяці байдарках — па 4 турысты. Колькі ўсяго турыстаў было ў паходзе?



Правообладатель Национальный институт образования

# Урок 26



?

4 + 5 · 3



24 – 2 · 4

У выразах БЕЗ ДУЖАК спачатку выконваюць множанне або дзяленне (злева направа), а потым складанне або адніманне (злева направа).

$16 \overset{②}{–} 2 \overset{①}{\cdot} 5$ $\quad 18 \overset{②}{+} 9 \overset{①}{:} 3$ $\quad 5 \overset{①}{\cdot} 2 \overset{②}{+} 25$ $\quad 21 \overset{①}{:} 7 \overset{②}{–} 3$

$8 \overset{①}{\cdot} 2 \overset{③}{+} 9 \overset{②}{\cdot} 4$ $\quad 100 \overset{②}{–} 72 \overset{①}{:} 9 \overset{③}{+} 4$

**1.** Прачытай і параўнай выразы. Вызнач парадак выканання дзеянняў і знайдзі значэнні выразаў.

| | | |
|---|---|---|
| 35 : 5 · 2 | 20 : 5 · 2 | 60 + 20 : 4 + 5 |
| 35 : 5 + 2 | 20 – 5 · 2 | 60 + 20 : 4 · 5 |

**2.** Састаў выразы і знайдзі іх значэнні.

| Памяншаемае | 54 | 43 | 7 · 9 | 16 : 2 |
|---|---|---|---|---|
| Аднімаемае | 3 · 7 | 64 : 8 | 2 · 4 | 72 : 9 |

**3.** На колькі адзін лік большы або меншы за другі? У колькі разоў адзін лік большы або меншы за другі?

15 і 3 | 8 і 64 | 81 і 9 | 45 і 9

**4.** Нарыхтавалі 4 двухлітровыя слоікі з сокам і 6 трохлітровых слоікаў з кампотам. Колькі літраў соку і кампоту нарыхтавалі?



Правообладатель Национальный институт образования

## Урок 26

КАСТРЫЧНІК

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| ПН | | 4 | 11 | 18 | 25 |
| АЎТ | | 5 | 12 | 19 | 26 |
| СР | | 6 | 13 | 20 | 27 |
| ЧЦ | | 7 | 14 | 21 | 28 |
| ПТ | 1 | 8 | 15 | 22 | 29 |
| СБ | 2 | 9 | 16 | 23 | 30 |
| НДЗ | 3 | 10 | 17 | 24 | 31 |

**5.** У кастрычніку ў першыя два тыдні было сонечнае надвор'е, а астатнія дні былі пахмурныя. Колькі пахмурных дзён было ў кастрычніку?

**6.** Шырыня прамавугольніка — 4 см, што ў 6 разоў менш за яго даўжыню. Знайдзі перыметр прамавугольніка.

**7.** Маса адной морквіны роўная масе дзвюх радысак. Што лягчэйшае: 4 морквіны або 7 радысак?

Яна кажа:

Каб адказаць на пытанне, трэба даведацца, колькі радысак роўныя па масе чатыром морквінам.

Алесь кажа:

Каб адказаць на пытанне, трэба даведацца, колькі морквін роўныя па масе чатыром радыскам.

Чыя праўда?

Вызнач парадак выканання дзеянняў і вылічы.

100 – 10 : 5 　　8 : 2 + 10 　　9 · 4 – 48 : 6

**1.** Пакажы парадак выканання дзеянняў і знайдзі значэнні выразаў.

40 – 6 · 5 　　7 · 8 + 15 　　9 · 6 + 81 : 9

**2.** На пошце прынялі 6 пасылак, па 9 кг кожная, і 3 пасылкі, па 7 кг кожная. Якая маса ўсіх прынятых пасылак?



Правообладатель Национальный институт образования

# Урок 27

У выразах З ДУЖКАМІ спачатку вылічваюць значэнні выразаў у дужках. Затым выконваюць множанне або дзяленне (злева направа), а потым складанне або адніманне (злева направа).

$40 \overset{2}{:} (18 \overset{1}{-} 10)$ $\qquad$ $(43 \overset{1}{-} 38) \overset{2}{\cdot} 7$

$6 \overset{2}{\cdot} (2 \overset{1}{+} 7) \overset{3}{-} 42$ $\qquad$ $56 \overset{2}{:} 7 \overset{3}{+} (100 \overset{1}{-} 45)$

**1.** Прачытай выразы. Вызнач парадак выканання дзеянняў і знайдзі значэнні выразаў.

| | | |
|---|---|---|
| 63 : (18 – 9) | (54 – 50) · 9 | 42 : 6 · 7 |
| (59 + 4) : 7 | 8 · (2 + 6) | 48 : 8 + 47 |

**2.** Прачытай выразы. Вызнач парадак выканання дзеянняў і знайдзі значэнні выразаў.

| | |
|---|---|
| 27 + (13 – 3) : 5 | 64 : (72 – 64) + 72 |
| (45 – 20) – 48 : 8 | 100 – 36 : (48 : 8) |

**3.** Састаў выразы і знайдзі іх значэнні.

- Рознасць лікаў 60 і 30 паменшыць у 3 разы.
- Здабытак лікаў 7 і 8 паменшыць на 47.
- Дзель лікаў 49 і 7 павялічыць у 9 разоў.
- Лік 27 павялічыць на дзель лікаў 36 і 6.

**4.** Разгледзь розныя спосабы запісу рашэння задачы. У школьнай сталовай за 4 столікі селі па 6 вучняў, а за 5 столікаў — па 8 вучняў. Колькі вучняў сядзелі за гэтымі столікамі?

1) 6 · 4 = 24 (вуч.)
2) 8 · 5 = 40 (вуч.)
3) 24 + 40 = 64 (вуч.)

6 · 4 + 8 · 5 = 64 (вуч.)



Правообладатель Национальный институт образования

**5.** Дапоўні ўмову задачы лікавымі данымі схемы. Запішы рашэнне задачы па дзеяннях і выразах.
З трох кустоў сабралі па ? бульбін, а з шасці кустоў — па ?. Колькі ўсяго бульбін сабралі з гэтых кустоў?




**6.** Прачытай умову задачы. Адкажы на пытанні.
Маса кошкі — 2 кг, сабакі — 18 кг, казы — 40 кг.
- На колькі кілаграмаў каза цяжэйшая за кошку?
- У колькі разоў кошка лягчэйшая за сабаку?
- Ці правільна, што маса сабакі на 20 кг меншая за масу казы?

**7.** Для экскурсіі заказалі два мікрааўтобусы, па 15 месцаў у кожным, і адзін аўтобус на 42 месцы. Колькі чалавек паехалі на экскурсію, калі ўсе месцы былі занятыя?

Вызнач парадак выканання дзеянняў і вылічы.

10 + 81 : 9 | 64 : (98 – 90) | 3 · (64 – 59) + 15

**1.** Вызнач парадак выканання дзеянняў. Вылічы.
(65 – 9) : 8 + 93 | 7 · (18 : 3) – 36

**2.** Для гасцініцы купілі 3 пакеты пральнага парашку для белай бялізны, па 3 кг кожны, і 4 пакеты пральнага парашку для каляровай бялізны, па 5 кг кожны. Якая маса купленага парашку?



Правообладатель Национальный институт образования

# Урок 28

| | | |
|---|---|---|
| 25 + 5 | 25 + $a$ | $a$, $b$, $c$ — лацінскія літары. |
| 64 : 8 | 64 : $b$ | $a$ — чытаем «а». |
| 42 – 17 | 42 – $c$ | $b$ — чытаем «бэ». |
| | | $c$ — чытаем «цэ». |

У выразах могуць выкарыстоўвацца не толькі лікі, але і літары.

Літару можна замяняць рознымі лікамі і знаходзіць значэнні выразаў.

Літару ў выразе называюць **зменнай**.

**1.** Прачытай выразы. Знайдзі значэнні выразаў, калі $a = 20$, $b = 25$. Запішы па ўзоры.

$a + 20$
$20 + 20 = 40$

$a - 20$ $b + 75$ $a + b$
$a + 79$ $b - 0$ $b - a$

**2.** Вылічы.

28 : 7 + 6 · 2
35 : 7 + 6 · 3
42 : 7 + 6 · 4

5 · 5 + (100 – 95)
5 · 6 + (100 – 96)
5 · 7 + (100 – 97)

Якім можа быць наступны выраз у кожным слупку?

**3.** Растлумач выразы.
У першай каробцы 12 кубікаў, у другой каробцы $a$ кубікаў, а ў трэцяй — $b$ кубікаў.

$12 + a$ $b - a$ $12 + a + b$ $a + b$ $12 : b$

**4.** Па 9 яблыкаў ляжала ў некалькіх пакетах, усяго было 45 яблыкаў. Колькі было пакетаў?



Правообладатель Национальный институт образования

**5.** Замяні ў задачы літары лікамі з табліцы. Рашы задачу. Складзі адваротныя задачы.
Швачка за адну гадзіну можа пашыць $c$ навалачак. Колькі навалачак можа пашыць швачка за $d$ гадзін?

| Навалачак за 1 гадзіну (шт.) | Час працы (г) | Усяго навалачак (шт.) |
|---|---|---|
| 6 | 8 | ? |

**6.** На станцыі было 3 цягнікі, па 9 вагонаў у кожным, і 2 цягнікі, па 7 вагонаў у кожным. Колькі ўсяго вагонаў у гэтых цягніках?

**7.** Начарці ў сшытку такія фігуры. Параўнай іх перыметры.



Прачытай выразы. Знайдзі іх значэнні, калі $a = 3$, $b = 8$, $c = 0$.

$5 \cdot a$ $\quad$ $64 : b$ $\quad$ $74 - c$

**1.** Вылічы.
$19 + (37 - 29) \cdot 4$ $\qquad$ $(7 + 42) : 7 \cdot 8$

**2.** Пры пераправе цераз раку 12 геолагаў паплылі на катары, а астатнія геолагі — на дзвюх лодках, па 8 чалавек у кожнай. Колькі было геолагаў?



Правообладатель Национальный институт образования

# Урок 29

Прачытай некалькі лацінскіх літар.
Якія з іх ты ведаеш?

| *A a* | *B b* | *C c* | *D d* | *K k* | *L l* | *M m* | *N n* | *O o* | *P p* |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| а | бэ | цэ | дэ | ка | эль | эм | эн | о | пэ |

Адрэзак *AB*

Прамая *CD*



Вугал *LKM*



Ломаная *MNOP*



Трохвугольнік *ABC*

**1.** Назаві фігуры.










**2.** Першы адрэзак мае даўжыню 6 см, што ў 2 разы больш за даўжыню другога адрэзка. Начарці гэтыя адрэзкі. Абазнач іх літарамі.

**3.** У ломанай *KLMN* кожнае звяно мае даўжыню 23 см. Знайдзі даўжыню гэтай ломанай.

**4.** Састаў па табліцы здабыткі. Знайдзі іх значэнні.

| $a$ | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
|---|---|---|---|---|---|---|
| $a \cdot 9$ | ? | ? | ? | ? | ? | ? |



Правообладатель Национальный институт образования

**5.** Вылічы.

| | | |
|---|---|---|
| 18 : 3 · 2 + 2 | 18 : (3 · 2) + 2 | (100 – 66) + 9 |
| 32 : 8 · 6 | 18 : 3 · (2 + 2) | 65 – (70 – 53) |

**6.** Выберы выраз, які з'яўляецца рашэннем задачы. Знайдзі яго значэнне, калі $b = 10$.

Купілі 6 набораў пэндзлікаў, па 4 пэндзлікі ў кожным наборы, і $b$ алоўкаў. Колькі ўсяго пэндзлікаў і алоўкаў купілі?

$4 \cdot 6$ $\quad$ $4 \cdot 6 + b$ $\quad$ $4 + 6 + b$ $\quad$ $4 \cdot 6 - b$

**7.** Замяні ва ўмове задачы літары лікамі з табліцы. Рашы задачу.

У $a$ кошыках па $c$ кг яблыкаў, а ў $b$ кошыках — па $d$ кг груш. Колькі ўсяго кілаграмаў яблыкаў і груш у гэтых кошыках?

| | Маса аднаго кошыка (кг) | Колькасць кошыкаў (шт.) | Маса ўсіх кошыкаў (кг) |
|---|---|---|---|
| Яблыкі | 5 | 3 | ? |
| Грушы | 4 | 6 | ? |

?

**8.** Сума трох лікаў роўная 75. Сума першага і другога роўная 60, а сума першага і трэцяга роўная 39. Знайдзіце гэтыя лікі.

Прачытай лацінскія літары: *A, B, C, D, K, L, M, N*.

**1.** Вылічы.

100 – (47 + 16) : 7 $\quad$ 48 : (32 – 24) · 5

**2.** З аднаго пчальніка прывезлі 17 кг мёду, а з другога — 19 кг. Увесь мёд разлілі ў 9 аднолькавых слоікаў. Колькі кілаграмаў мёду атрымалася ў кожным слоіку?



Правообладатель Национальный институт образования

# Урок 30




Трохвугольнік *KLM* — востравугольны.
У яго ўсе вуглы вострыя.




Трохвугольнік *ABC* — прамавугольны.
У яго ёсць прамы вугал.




Трохвугольнік *NOP* — тупавугольны.
У яго ёсць тупы вугал.

**1.** Назаві прамавугольны, востравугольны, тупавугольны трохвугольнікі.










**2.** Знайдзі значэнні выразаў $8 + a$ і $8 \cdot a$, калі $a$ роўна 3; 5; 7; 9.

**3.** Знайдзі значэнні выразаў, калі $m = 20$, $n = 2$.

$46 + (m - 4 : n)$ $\qquad$ $46 + (m - 4) : n$



Правообладатель Национальный институт образования

**4.** Устаў прапушчаныя лікі, каб роўнасці былі правільныя.

(56 + 27) + ? = 86 (30 – 22) + ? = 64

(69 – 26) + ? = 67 (84 – 5) + ? = 100

**5.** Растлумач з дапамогай схемы розныя спосабы рашэння задачы. З адной стаянкі паехала 8 машын, а з другой — у 3 разы больш. Колькі ўсяго машын паехала?




1 8 · 3 → ? + 8 → ?

2 1 + 3 → 8 · ? → ?

**6.** Рашы задачу рознымі спосабамі.
Колькі ўсяго метраў тканіны купілі, калі шоўку купілі 6 м, а льнянога палатна — у 5 разоў больш?

**7.** У першым фотаальбоме на 5 аркушаў больш, чым у другім, а ў трэцім — на 7 аркушаў больш, чым у першым. У якім фотаальбоме аркушаў больш — у другім або ў трэцім? На колькі аркушаў больш?

Як называецца трохвугольнік, у якога ўсе вуглы вострыя? Як называецца трохвугольнік, у якога ёсць прамы вугал? Тупы вугал?

**1.** Вылічы.

(100 – 4 · 6) – 35 65 – (5 · 6 – 1)

**2.** Рашы задачу рознымі спосабамі.
У ломанай *ABC* два звяны. Даўжыня звяна *AB* — 4 дм. Звяно *BC* у 3 разы даўжэйшае за звяно *AB*. Знайдзі даўжыню ломанай *ABC*.



Правообладатель Национальный институт образования

## Урокі 31–33

**1.** Вылічы.

93 – (46 + 19)  15 + (80 – 36)  (28 + 33) – 48

**2.** Знайдзі значэнні выразаў.

| | | |
|---|---|---|
| 18 : 6 · 8 | 3 · 8 : 6 | 48 : 6 · 4 |
| 54 : 6 : 3 | 2 · 2 · 7 | 27 : 9 · 4 |

**3.** Вылічы.

(34 + 38) : 8  81 : (71 – 62)  52 – 5 · 8

**4.** Вылічы.

18 : 3 + 54 : 9  (66 – 35) + 4 · 9

6 · 8 – 72 : 9  72 – 72 : (3 · 3)

**5.** Састаў выразы. Знайдзі іх значэнні.

- Ад здабытку лікаў 9 і 9 адняць дзель лікаў 64 і 8.
- Да ліку 27 дадаць здабытак лікаў 6 і 7.
- Дзель лікаў 49 і 7 павялічыць у 8 разоў.
- Да здабытку лікаў 6 і 6 дадаць рознасць лікаў 51 і 29.

**6.** Састаў выразы і знайдзі іх значэнні.

| $a$ | 39 | 51 | 63 | 24 | 45 |
|---|---|---|---|---|---|
| $37 + a$ | ? | ? | ? | ? | ? |
| $100 - a$ | ? | ? | ? | ? | ? |

**7.** На дзевяці паліцах кніжнай шафы знаходзіцца па некалькі кніг, пароўну на кожнай. Усяго ў кніжнай шафе 81 кніга. Колькі кніг на кожнай паліцы?

**8.** Карыне 8 гадоў. Яна ў 2 разы маладзейшая за свайго брата. На колькі гадоў брат старэйшы за Карыну?



Правообладатель Национальный институт образования

**9.** У кветкавым магазіне зрабілі 9 букетаў руж, па 7 штук у кожным, і 6 букетаў гваздзікоў, па 5 гваздзікоў у кожным. Колькі ўсяго кветак было ў гэтых букетах?

**10.** Для вышывання першага ўзору трэба 32 м нітак, для другога — у 4 разы менш. Ці хопіць для вышывання гэтых узораў дзевяці шпулек, калі ў кожнай з іх па 5 м нітак?

**11.** У першы дзень адрамантавалі 4 м паркавай дарожкі, а ў другі дзень — у 3 разы больш. Колькі метраў паркавай дарожкі адрамантавалі за два дні?

**12.** Складзі і рашы задачы.

1

2




**13.** Растлумач выразы.
Уладзік скаціўся з гары на лыжах $a$ разоў, на снаўбордзе — $b$ разоў і на санках — 7 разоў.

$a + b$ | $a + b + 7$ | $b : 7$ | $b - 7$

**14.** Складзі пытанне да задачы 13 так, каб яна рашалася двума дзеяннямі. Рашы задачу, калі $a = 28$, $b = 21$.

**15.** Начарці ломаную *MNOP*, даўжыня першага звяна якой — 6 см, што ў 3 разы больш за даўжыню другога звяна, а трэцяе звяно — у 2 разы карацейшае за першае звяно.



Правообладатель Национальный институт образования

## Правер сябе

**1.** Знайдзі няправільную роўнасць.

А) 7 · 9 = 63 Б) 3 · 7 = 21 В) 48 : 6 = 8 Г) 36 : 9 = 3

**2.** Знайдзі, у якім выпадку няправільна вызначаны парадак выканання дзеянняў.

А) ② ① ③ 4 · (3 + 6) – 14

Б) ③ ① ② 90 – 81 : 9 + 8

В) ② ③ ① 6 · 7 + (30 – 15)

Г) ① ③ ② 7 · 3 – 9 · 2

**3.** Знайдзі тупавугольны трохвугольнік.

А)  Б)  В)  Г)

**4.** Знайдзі правільнае рашэнне задачы.

Пасадзілі 8 радоў вішань, па 5 дрэў у радзе, і 7 радоў сліў, па 6 дрэў у радзе. Колькі ўсяго дрэў пасадзілі?

А) 5 · 8 + 6 · 7 Б) 8 · 7 + 5 · 6 В) 5 · 8 + 6 Г) 8 + 6 · 7

**5.** Разгледзь, як Гена павярнуў фігуру тры разы.



Як будзе размешчана фігура пасля трынаццатага павароту?

А)  Б)  В)  Г)



Правообладатель Национальный институт образования

## Заданні і праекты

**1.** Вазьміце палоску паперы і склейце яе так, як паказана на малюнку. Уявіце сабе, што атрымаецца, калі склееную палоску разрэзаць нажніцамі так, як паказана на малюнку. Праверце сваю здагадку.



**2.** Вазьміце палоску паперы і перад склейваннем пераскруціце яе адзін раз так, як паказана на малюнку. Затым склейце палоску.

Вы атрымалі стужку Мёбіуса.





Уявіце сабе, што атрымаецца, калі склееную палоску разрэзаць нажніцамі так, як паказана на малюнку. Праверце сваю здагадку.

**3.** Вазьміце палоску паперы і перад склейваннем пераскруціце яе два разы так, як паказана на малюнку. Затым склейце палоску. Уявіце сабе, што атрымаецца, калі склееную палоску разрэзаць нажніцамі так, як паказана на малюнку. Праверце сваю здагадку.





**4.** Даведайцеся, якія яшчэ доследы можна правесці са стужкай Мёбіуса. Пакажыце вашы доследы сябрам у класе.



Правообладатель Национальный институт образования

# Урок 34

У сямі аднолькавых пакетах 14 л соку. Купілі 2 такія пакеты з сокам. Колькі літраў соку купілі?

- Спачатку вызначу ўмяшчальнасць аднаго пакета.
- Потым даведаюся, колькі літраў соку купілі.






**1.** На 4 сукенкі зрасходавалі 12 м тканіны, пароўну на кожную. Колькі метраў тканіны зрасходуюць на 6 такіх сукенак?

| Расход тканіны на 1 сукенку (м) | Колькасць сукенак (шт.) | Агульны расход тканіны (м) |
|---|---|---|
| аднолькавы | 4 | 12 |
| | 6 | ? |

- Што даведаемся спачатку?

- Што даведаемся потым?




**2.** Знайдзі значэнні выразаў.

(24 + 48) : 9 · 7
27 : 3 · (48 – 39)
63 : (52 – 45) · 4
8 · 7 + 6 · 4



Правообладатель Национальный институт образования

**3.** Знайдзі значэнні выразаў, калі $a = 4$.

| | | | |
|---|---|---|---|
| $a \cdot 6 : 3$ | $24 : a + 3$ | $62 - a + 42$ | $21 + (12 - a)$ |

**4.** Вылічы. Выканай праверку.

| | | | |
|---|---|---|---|
| 64 + 31 | 78 + 7 | 36 + 23 | 27 + 73 |
| 71 – 29 | 97 – 22 | 85 – 38 | 100 – 66 |

**5.** Турысты селі ў байдаркі, па 4 чалавекі ў кожную. Для гэтага спатрэбілася 6 байдарак. Колькі было турыстаў?

**6.** Рашы задачу рознымі спосабамі.
На адным узроўні паркінга 8 свабодных месцаў, а на другім — у 4 разы больш. Колькі свабодных месцаў у паркінгу на гэтых узроўнях?

**7.** Начарці ломаную, даўжыня якой вылічваецца так:

3 см · 2 + 4 см + 1 см

**8.** Дамінік жыве ў дзевяціпавярховым доме. На кожным паверсе па 4 кватэры. У якім пад'ездзе і на якім паверсе жыве Дамінік, калі нумар яго кватэры 86?

Колькі яек у трох упакоўках, калі ў дзвюх такіх упакоўках 12 яек?

**1.** Знайдзі значэнні выразаў.

| | | |
|---|---|---|
| $7 \cdot 5 - 19$ | $3 \cdot 9 + 9 \cdot 4$ | $8 \cdot (23 - 19)$ |

**2.** У сямі аднолькавых кнігах 28 малюнкаў. Колькі малюнкаў у трох такіх кнігах?



Правообладатель Национальный институт образования

# Урок 35

Замяні сумы здабыткамі. Знайдзі значэнні выразаў.

1 + 1 + 1 　　1 + 1 　　1 + 1 + 1 + 1 + 1 + 1

Пры множанні 1 на лік атрымліваецца лік, на які множылі.

$1 \cdot a = a$

Пры множанні ліку на 1 атрымліваецца лік, які множылі.

$a \cdot 1 = a$

**1.** Знайдзі значэнні выразаў.

$1 \cdot 7$ 　　$(9 + 34) \cdot 1$ 　　$45 : 9 \cdot 1$

$9 \cdot 1$ 　　$1 \cdot (100 - 1)$ 　　$1 \cdot 49 : 7$

**2.** Састаў выразы. Знайдзі іх значэнні.

| $c$ | 3 | 5 | 6 | 8 | 1 |
|---|---|---|---|---|---|
| $32 + c \cdot 4$ | ? | ? | ? | ? | ? |
| $6 \cdot c - 6$ | ? | ? | ? | ? | ? |

**3.** Устаў прапушчаныя лікі, каб роўнасці былі правільныя.

$(64 - 40) - ? = 12$ 　　$(34 + 58) - ? = 29$

$? + (18 + 46) = 100$ 　　$? + (96 - 27) = 88$

**4.** Устаў прапушчаныя лічбы.

$$\begin{array}{r} 5* \\ +\ *9 \\ \hline 83 \end{array} \qquad \begin{array}{r} *4 \\ +\ 4* \\ \hline 100 \end{array} \qquad \begin{array}{r} 4* \\ -\ *5 \\ \hline 28 \end{array} \qquad \begin{array}{r} *7 \\ -\ 3* \\ \hline 29 \end{array}$$



Правообладатель Национальный институт образования

**5.** У трох аднолькавых наборах было 27 гуашавых фарбаў. Колькі гуашавых фарбаў у пяці такіх наборах?

- Што трэба ведаць, каб адказаць на пытанне задачы?
- Што трэба ведаць, каб вызначыць колькасць гуашавых фарбаў у адным наборы?




**6.** У магазіне прадалі 5 упаковак з ёгуртам, па 6 бутэлечак у кожнай, і 3 упакоўкі з ёгуртам, па 4 бутэлечкі ў кожнай. Колькі ўсяго бутэлечак з ёгуртам было прададзена?

**7.** Складзі і рашы задачы.







**8.** Колькі маленькіх жоўтых кубікаў трэба ўзяць Толю, каб скласці адзін вялікі зялёны кубік?




Які лік атрымаецца, калі памножыць 1 на 18? Калі 18 памножыць на 1?

**1.** Знайдзі значэнні выразаў.

(64 – 48) · 1 6 · 1 · 3 100 – 1 · 27 : 9

**2.** У пяці аднолькавых каробках 35 кг цукерак «Лявоніха». Колькі кілаграмаў цукерак «Лявоніха» ў васьмі такіх каробках?



Правообладатель Национальный институт образования

# Урок 36

Замяні сумы здабыткамі. Знайдзі значэнні выразаў.

$0 + 0$ $0 + 0 + 0 + 0$ $0 + 0 + 0 + 0 + 0 + 0$

Пры множанні 0 на лік атрымліваецца 0.

$0 \cdot b = 0$

Пры множанні ліку на 0 атрымліваецца 0.

$b \cdot 0 = 0$

**1.** Знайдзі значэнні выразаў.

$0 \cdot 6$ $15 \cdot (0 + 1)$ $13 \cdot 0 + 87$

$5 \cdot 0$ $(100 - 34) \cdot 0$ $0 \cdot (68 - 22)$

**2.** Састаў выразы. Знайдзі іх значэнні.

| Складаемае | $1 \cdot 6$ | $2 \cdot 9$ | $72 : 9$ | $0 \cdot 15$ |
|---|---|---|---|---|
| Складаемае | $5 \cdot 7$ | $6 \cdot 0$ | $2 \cdot 1$ | $36 : 9$ |

**3.** Выразі ў гадзінах і мінутах.

75 мін 82 мін 64 мін 93 мін

**4.** У магазіне 27 кг морквы расфасавалі ў некалькі пакетаў. У кожным пакеце аказалася 3 кг морквы. Колькі атрымалася пакетаў?

**5.** Даўжыня адной дарожкі — 9 м, а даўжыня другой дарожкі — у 3 разы большая. Ці хопіць 70 м бардзюрнай пліткі для рамонту дзвюх гэтых дарожак, калі гэту плітку трэба класці з абодвух бакоў кожнай дарожкі?





Правообладатель Национальный институт образования

**6.** Дапоўні задачу данымі табліцы. Рашы задачу.
У ? скрынях ? кг цыбулі, пароўну ў кожнай. Колькі кілаграмаў цыбулі ў ? такіх скрынях?

| Маса адной скрыні (кг) | Колькасць скрынь (шт.) | Маса ўсіх скрынь (кг) |
|---|---|---|
| аднолькавая | 6 | 48 |
| | 3 | ? |

**7.** Перыметр квадрата *ABCD* роўны 1 дм 6 см. Знайдзі перыметр квадрата *KLMN*, калі даўжыня яго стараны на 5 см большая за даўжыню стараны квадрата *ABCD*.

**8.** Алесь заплаціў за 2 сшыткі і лінейку 11 рублёў, а Яна за 2 такія сшыткі і 2 такія лінейкі — 14 рублёў.

Алесь кажа:
Адзін сшытак каштуе 4 рублі.

Яна кажа:
Адзін сшытак каштуе 3 рублі.

Чыя праўда?

Які лік атрымаецца, калі 0 павялічыць у 100 разоў? Чаму будзе роўны здабытак лікаў 100 і 0?

**1.** Вылічы.
$15 \cdot 0 + 13$ $\quad 100 - 0 \cdot 84$ $\quad 90 - 6 \cdot 9 + 54$

**2.** У сямі аднолькавых каністрах 42 л вады. Купілі 4 такія каністры. Колькі літраў вады купілі?



Правообладатель Национальный институт образования

# Урок 37

Знайдзі значэнні выразаў. Растлумач.

| | |
|---|---|
| 1 · 8 = 8 | 1 · 15 = 15 |
| 8 : 1 = ? | 15 : 1 = ? |
| 8 : 8 = ? | 15 : 15 = ? |

Пры дзяленні ліку на 1 атрымліваецца лік, які дзялілі.

$a : 1 = a$

Пры дзяленні ліку на гэты ж лік атрымліваецца 1.

$a : a = 1$

**1.** Знайдзі значэнні выразаў.

| | | |
|---|---|---|
| 4 · 1 | 1 · 29 | 6 · 1 : 1 |
| 4 : 4 | 29 : 1 | 9 : 1 · 1 |
| 4 : 1 | 29 : 29 | 7 : 1 · 0 |

**2.** Кожны з лікаў 8, 16, 24, 32, 36 паменшы ў 4 разы, а вынік павяліч на 50. Састаў роўнасці.

**3.** Запішы ў слупок. Вылічы.

79 – 16 7 + 36 81 – 28 31 + 54 + 9

**4.** У каробцы 6 радоў цукерак, па 5 цукерак у кожным радзе. Колькі цукерак застанецца ў каробцы, калі:

1) узяць усе цукеркі з аднаго рада;
2) колькасць радоў паменшыць на 3;
3) з кожнага рада ўзяць 1 цукерку;
4) з кожнага рада ўзяць 4 цукеркі?

**5.** На 4 аднолькавыя стужкі для гімнастак пайшло 20 м атласнай тканіны. Колькі метраў атласнай тканіны пойдзе на 8 такіх стужак?



Правообладатель Национальный институт образования

**6.** На спаборніцтвах 25 хлопчыкаў і 29 дзяўчынак падзяліліся на каманды па 6 чалавек. Колькі каманд атрымалася?

**7.** Складзі і рашы задачу. Складзі адваротныя задачы.




**8.** Алесь намаляваў літару Г, зафарбаваўшы некалькі клетак у сшытку. Ці правільна Алесь паказаў у табліцы, колькі клетак ён зафарбаваў?
Ці можна намаляваць літары О і П, зафарбаваўшы столькі клетак, колькі паказана ў табліцы?



| | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Г** | | | | | | | | | | | | |
| **О** | | | | | | | | | | | | |
| **П** | | | | | | | | | | | | |

Чаму роўная дзель лікаў 50 і 1?
Дзель лікаў 50 і 50?

**1.** Знайдзі значэнні выразаў.
54 : (9 : 1)  19 : 19 · 0  80 : 80 + (21 + 7) · 1

**2.** Для таго каб звязаць 4 пары аднолькавых рукавіц, бабулі спатрэбілася 16 маткоў пражы. Колькі маткоў пражы пайшло на 2 пары такіх рукавіц?



Правообладатель Национальный институт образования

# Урок 38

Знайдзі значэнні выразаў. Растлумач.

| | | |
|---|---|---|
| 0 · 6 = 0 | 0 · 9 = 0 | 0 · 15 = 0 |
| 0 : 6 = 0 | 0 : 9 = ? | 0 : 15 = ? |

Пры дзяленні ліку 0 на другі лік атрымліваецца 0.

$0 : a = 0$

Дзяліць на 0 нельга!

~~$a : 0$~~

**1.** Знайдзі значэнні выразаў.

| | | | |
|---|---|---|---|
| 0 · 39 | 48 · 0 | 0 : 16 | 1 · 8 · 8 |
| 0 : 39 | 0 : 48 | 0 : 21 | 49 : 7 · 0 |

**2.** Выберы выразы, у якіх нельга знайсці значэнне. Растлумач.

| | |
|---|---|
| 15 + 0 : 4 + 80 | 29 : (10 – 2 · 5) |
| 33 + 45 : (5 · 0) | 0 : 17 + 24 : 24 |

**3.** Параўнай.

| | |
|---|---|
| 12 ? 12 · 1 | 12 + 1 ? 1 · 12 |
| 12 ? 12 · 0 | 12 · 0 ? 0 + 12 |

**4.** Устаў прапушчаныя лікі, каб роўнасці былі правільныя.

9 · ? = 0 15 : ? = 15 ? : 23 = 0

**5.** Састаў правільныя роўнасці і няроўнасці, выкарыстоўваючы выразы.

| | | | |
|---|---|---|---|
| 5 · 6 | 29 + 1 | 42 – 11 | 6 · 5 |



Правообладатель Национальный институт образования

**6.** На стале ляжыць некалькі стосаў сшыткаў, па 7 сшыткаў у кожным стосе. Усяго 63 сшыткі. Колькі стосаў сшыткаў на стале?

**7.** У магазіне было 72 л будаўнічага клею ў васьмілітровых бляшанках і 40 л фарбы. Пяць бляшанак з клеем прадалі. Колькі літраў клею засталося?

**8.** Растлумач выразы.
Павел загрузіў з інтэрнэту 8 песень, Вадзім — у $a$ разоў больш песень, чым Павел, а Стас — $b$ песень.

$8 \cdot a$ $8 + b$ $8 \cdot a + b$ $8 \cdot a + 8 + b$

**9.** Выберы схему. Рашы задачу.
Юлія вышэйшая за Уладзіславу на 6 см. Уладзіслава вышэйшая за Надзею на 4 см. Параўнай рост Юліі і Надзеі.

1




2




**10.** На колькі сантыметраў павялічыцца перыметр квадрата, калі яго старану павялічыць на 1 см? На 2 см? На 3 см?

Знайдзі дзель лікаў 0 і 15.

**1.** Устаў прапушчаныя лікі, каб роўнасці былі правільныя.

? : 8 = 0 ? · 27 = 27 ? · 38 = 0

**2.** Было 8 кг грэчкі, што ў 3 разы менш, чым рысу. Увесь рыс рассыпалі ў пакеты па 4 кг. Колькі пакетаў з рысам атрымалася?



Правообладатель Национальный институт образования

# Урок 39

Растлумач вылічэнні.

$10 \cdot 3 = 30$
$3 \cdot 10 = 30$
$30 : 10 = 3$
$30 : 3 = 10$



**1.** Знайдзі значэнні выразаў.

| | | | |
|---|---|---|---|
| $10 \cdot 7$ | $70 : 10$ | $10 \cdot 3$ | $30 : 10$ |
| $7 \cdot 10$ | $70 : 7$ | $3 \cdot 10$ | $30 : 3$ |

**2.** Параўнай.

$14 \cdot 0 \,?\, 14 \cdot 1$
$42 : 42 \,?\, 42 : 1$
$10 \cdot 4 \,?\, 8 \cdot 5$
$30 \cdot 1 \,?\, 30 - 1$
$0 + 14 \,?\, 14 \cdot 0$
$90 : 10 \,?\, 54 : 6$

**3.** Вылічы.

$87 - 39 + 25$
$87 - (39 + 25)$
$87 - 39 - 25$
$81 : 9 \cdot (80 : 8)$
$16 : (20 : 10) \cdot 7$
$3 \cdot 10 : 5 \cdot 0$

**4.** Выканай дзеянні. Вынік запішы ў дэцыметрах і сантыметрах.

34 см + 29 см – 16 см
1 м – 55 см + 18 см
10 дм – 78 см + 24 см
9 дм – 5 дм – 21 см

**5.** Знайдзі значэнні выразаў $35 + a$ і $35 : a$, калі $a$ роўна 1; 5; 7; 35.

Ці можна знайсці значэнні гэтых выразаў, калі $a$ роўна 0?

**6.** У офісе ў пяці аднолькавых кабінетах расставілі 50 сталоў, пароўну ў кожны. Колькі сталоў у трох кабінетах?



Правообладатель Национальный институт образования

**7.** Складзі і рашы задачы па схемах.







**8.** Растлумач выразы.
Купілі 5 дошак даўжынёй па 2 м кожная і 8 дошак даўжынёй па 5 м кожная.

$5 + 8$ $2 \cdot 5$ $5 - 2$ $5 \cdot 8$ $8 - 5$

**9.** Складзі пытанне да задачы 8 так, каб яна рашалася трыма дзеяннямі. Запішы рашэнне задачы.

**10.** Рашы задачу. Складзі адваротныя задачы.
Ягор і Лера выйшлі насустрач адно аднаму. Ягор прайшоў да сустрэчы 54 м, а Лера — 32 м. Колькі метраў было паміж імі спачатку?

Павяліч лік 10 у 5 разоў.
Паменшы лік 50 у 10 разоў.

**1.** Знайдзі значэнні выразаў.
$16 : 8 \cdot 10$ $10 \cdot (72 : 9)$ $(24 + 26) : 10 \cdot 1$

**2.** У пацерках Дануты 14 пацерачак. Гэта ў 2 разы менш, чым пацерачак у пацерках Соні. Колькі ўсяго пацерачак у гэтых двух пацерках?



Правообладатель Национальный институт образования

# Урок 40

**1.** Вылічы.

| | | |
|---|---|---|
| 34 · 1 + 45 | 57 + 48 · 0 | (45 – 38) · 10 |
| 73 – 29 : 29 | 62 : 1 – 25 | (67 + 23) : 10 |

**2.** Састаў выразы і знайдзі іх значэнні.

| $a$ | 49 | 70 | 60 | 18 | 10 | 0 |
|---|---|---|---|---|---|---|
| $b$ | 7 | 7 | 10 | 3 | 10 | 5 |
| $a : b$ | ? | ? | ? | ? | ? | ? |

**3.** Знайдзі значэнні выразаў.

| | |
|---|---|
| 88 – (72 – 62) · 3 | 54 : (18 : 2 – 8) |
| 37 + (65 – 15) : 10 | 36 · (72 : 9 – 7) |
| 69 – (74 – 34) : 4 | 40 : (9 · 5 – 5) |

**4.** Параўнай.

54 : 9 + 0 : 7 ? 63 : 9 · 0 + 6

49 : 7 – 8 · 0 ? 28 : 4 – 0 · 52

**5.** У шасці пакетах было па некалькі літраў соку, па-роўну ў кожным. Усяго ў пакетах было 18 л соку. Якая ўмяшчальнасць аднаго пакета?

**6.** У васьмі каробках 80 кг зефіру, пароўну ў кожнай. Колькі кілаграмаў зефіру ў пяці такіх каробках? На колькі кілаграмаў зефіру больш у васьмі каробках, чым у пяці каробках?

**7.** У аквапарку на адзін сеанс можна прадаць 100 бі-летаў. Было прададзена 34 дарослыя білеты, што на 23 білеты менш, чым дзіцячых. Колькі білетаў засталося прадаць?



Правообладатель Национальный институт образования

**8.** Выберы схему. Рашы задачу.
Ад куска шоўку даўжынёй 30 м адрэзалі 8 м, а ад куска арганзы такой жа даўжыні адрэзалі 10 м. Якой тканіны засталося больш? На колькі метраў больш?







**9.** З дзвюх фігур, паказаных на малюнку, склалі прамавугольнік. Начарці ў сшытку прамавугольнік, які атрымаўся. Вылічы яго перыметр.



**10.** Маса грушы роўная масе дзвюх слівў. На адной чашы вагаў 2 грушы і 2 слівы. Колькі слівў на другой чашы вагаў, калі вагі ў раўнавазе?

**1.** Устаў знакі дзеянняў, каб роўнасці былі правільныя.

| | | |
|---|---|---|
| 2 ? 1 = 2 | 0 ? 6 = 6 | 5 ? 5 = 0 |
| 1 ? 1 = 2 | 7 ? 0 = 0 | 5 ? 5 = 1 |

**2.** На велатрэку каталіся 8 дзяўчынак. Іх было ў 3 разы менш, чым хлопчыкаў. На колькі больш хлопчыкаў, чым дзяўчынак, каталася на велатрэку?



Правообладатель Национальный институт образования

# Урок 41



$20 \cdot 3 = 2$ дзяс. $\cdot 3 = 6$ дзяс. $= 60$
$60 : 3 = 6$ дзяс. $: 3 = 2$ дзяс. $= 20$
$60 : 20 = 6$ дзяс. $: 2$ дзяс. $= 3$

**1.** Вылічы і растлумач.

| | | | |
|---|---|---|---|
| $10 \cdot 4$ | $30 \cdot 2$ | $40 \cdot 2$ | $20 \cdot 4$ |
| $40 : 4$ | $60 : 2$ | $80 : 2$ | $80 : 4$ |
| $40 : 10$ | $60 : 30$ | $80 : 40$ | $80 : 20$ |

**2.** Вылічы па ўзоры.

$\frac{3 \cdot 20 = 60}{20 \cdot 3 = 60}$ $3 \cdot 30$ $4 \cdot 20$ $2 \cdot 50$

**3.** Знайдзі значэнні выразу $b + 20 \cdot b - 14$, калі $b$ роўна 1; 2; 3; 4.

**4.** Вылічы ў слупок. Выканай праверку.

| | | | |
|---|---|---|---|
| $83 - 26$ | $56 + 39$ | $77 - 49$ | $52 + 19$ |

**5.** Міша прынёс 30 л вады ў шасці аднолькавых вёдрах. Кожны раз ён прыносіў па 2 вядры вады. Колькі літраў вады Міша прыносіў кожны раз?

**6.** У запаведніку нарыхтавалі на зіму 10 стагоў сена для падкормкі зуброў, а для падкормкі ласёў — у 3 разы больш стагоў сена.

- Колькі ўсяго стагоў сена нарыхтавалі?
- На колькі больш стагоў сена нарыхтавалі для ласёў, чым для зуброў?



Правообладатель Национальный институт образования

**7.** Састаў выраз, які будзе рашэннем задачы.
Федзя кожную раніцу падцягваецца на турніку 5 разоў, а кожны вечар — $c$ разоў. Колькі разоў Федзя падцягваецца на турніку за тыдзень?

**8.** Знайдзі адказ задачы 7, калі $c$ роўна 3; 4; 5.

**9.** Дапоўні задачу па малюнку. Рашы задачу.
Даўжыня кожнай стараны трохвугольніка *ABC* роўная ? см, а даўжыня кожнай стараны трохвугольніка *MNP* роўная ? см. У колькі разоў перыметр трохвугольніка *MNP* меншы за перыметр трохвугольніка *ABC*?







Растлумач, як 40 памножыць на 2; як 40 падзяліць на 2; як 40 падзяліць на 20.

**1.** Вылічы.

| | |
|---|---|
| $30 \cdot 3 - 48$ | $80 : 4 : 5 \cdot 10$ |
| $2 \cdot 20 + 53$ | $80 : 40 \cdot 10 \cdot 4$ |

**2.** Мультфільм доўжыўся 30 мін, а рэклама — у 10 разоў менш. На колькі мінут рэклама доўжылася менш, чым мультфільм?



Правообладатель Национальный институт образования

# Урок 42

Колькі ўсяго груш? Разгледзь розныя спосабы вылічэнняў.



**Спосаб 1**

Колькі груш у адным радзе?

$4 + 2$

Колькі ўсяго груш?

$(4 + 2) \cdot 3$

**Спосаб 2**

Колькі жоўтых груш?

$4 \cdot 3$

Колькі чырвоных груш?

$2 \cdot 3$

Колькі ўсяго груш?

$4 \cdot 3 + 2 \cdot 3$

$$(4 + 2) \cdot 3 = 4 \cdot 3 + 2 \cdot 3$$

**Размеркавальная ўласцівасць множання**

Каб памножыць суму на лік, можна кожнае складаемае памножыць на гэты лік і атрыманыя вынікі скласці.

$$(a + b) \cdot c = a \cdot c + b \cdot c$$

**1.** Вылічы рознымі спосабамі.

$(4 + 3) \cdot 5$ $(2 + 5) \cdot 6$ $(3 + 7) \cdot 10$

$(1 + 8) \cdot 7$ $(4 + 6) \cdot 3$ $(4 + 1) \cdot 20$

**2.** Параўнай.

$(5 + 4) \cdot 3 \,?\, 5 \cdot 3 + 4$ $(9 + 0) \cdot 3 \,?\, 9 \cdot 3 + 0 \cdot 3$

$2 \cdot 3 + 6 \,?\, (2 + 6) \cdot 3$ $(20 + 10) \cdot 2 \,?\, 2 \cdot (20 + 10)$

$7 \cdot 2 + 3 \cdot 2 \,?\, (7 + 3) \cdot 2$ $(20 + 10) \cdot 3 \,?\, 20 + 10 \cdot 3$

У якіх выпадках можна выканаць параўнанне без вылічэнняў?

Правообладатель Национальный институт образования

**3.** Састаў выразы і знайдзі іх значэнні.

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Складаемае | 40 · 2 | 36 · 0 | 60 : 20 | 100 : 5 |
| Складаемае | 80 : 4 | 90 : 30 | 63 – 27 | 100 : 20 |

**4.** Растлумач, як можна рознымі спосабамі вылічыць перыметр прамавугольніка *ABCD*. Выкарыстоўвай размеркавальную ўласцівасць множання.

**Перыметр** фігуры абазначаюць лацінскай літарай *P*.

$P = (3 + 2) \cdot 2 = 10$ (см) $P = 3 \cdot 2 + 2 \cdot 2 = 10$ (см)

**5.** Знайдзі перыметр прамавугольніка *MNKL* з даўжынямі старон 40 см і 10 см.

**6.** У майстэрні было 50 рабочых — механікаў, слесараў і электрыкаў. Механікаў было 36. Механікаў было ў 4 разы больш, чым слесараў. Астатнія — электрыкі. Колькі электрыкаў у майстэрні?

**7.** У Машы, Каці і Лены былі кніга, часопіс і альбом. У Лены не было альбома і часопіса, у Машы не было альбома. Які прадмет быў у кожнай дзяўчынкі?

Знайдзі правільную роўнасць.

$(6 + 3) \cdot 4 = 6 + 3 \cdot 4$ $(6 + 3) \cdot 4 = 6 \cdot 4 + 3 \cdot 4$

**1.** Знайдзі значэнні выразаў.

$(46 – 6) : 2$ $3 \cdot 20 : 30$ $100 : 50 + (72 – 47)$

**2.** Вылічы рознымі спосабамі.
Знайдзі перыметр прамавугольніка *PRST* з даўжынямі старон 4 дм і 5 дм.



Правообладатель Национальный институт образования

# Урок 43

Як памножыць двухзначны лік на адназначны?







$34 \cdot 2 = (30 + 4) \cdot 2 = 30 \cdot 2 + 4 \cdot 2 = 60 + 8 = 68$

1. Прадстаўляю двухзначны лік у выглядзе сумы разрадных складаемых.
2. Множу кожнае складаемае на адназначны лік.
3. Атрыманыя вынікі складваю.

**1.** Знайдзі значэнні выразаў.

| | | | |
|---|---|---|---|
| 22 · 3 | 2 · 44 | 15 · 6 | 9 · 11 |
| 25 · 4 | 7 · 12 | 17 · 4 | 5 · 13 |

**2.** Састаў выразы і знайдзі іх значэнні.

- Ад сумы лікаў 25 і 46 адняць здабытак лікаў 4 і 12.
- Да здабытку лікаў 32 і 2 дадаць дзель лікаў 60 і 20.
- Здабытак лікаў 50 і 2 паменшыць на здабытак лікаў 4 і 15.
- Дзель лікаў 80 і 4 павялічыць на здабытак лікаў 3 і 12.

**3.** Вылічы.

| | |
|---|---|
| 45 : 9 · 6 + 1 | (10 + 30) · 2 – 80 |
| 74 – 36 : 6 – 15 | (20 + 40) : 6 + 90 |

**4.** Вылічы перыметр прамавугольніка, даўжыня якога — 13 см, а шырыня — 6 см.



Правообладатель Национальный институт образования

**5.** Растлумач, як можна рознымі спосабамі вылічыць перыметр квадрата *KLMN*.




$P = 3 + 3 + 3 + 3 = 12$ (см)

$P = 3 \cdot 4 = 12$ (см)

**6.** Знайдзі перыметр квадрата *ABCD* з даўжынёй стараны 12 дм.

**7.** Зрэзаныя хрызантэмы расставілі ў 4 вазы. У кожнай вазе аказалася па 7 хрызантэм. Колькі хрызантэм зрэзалі?

**8.** У пяці хакейных камандах гуляюць 30 хлопчыкаў, пароўну ў кожнай. Колькі хлопчыкаў гуляюць у сямі такіх камандах?

**9.** Дапоўні задачу данымі табліцы. Рашы задачу.
Афрыканскі слон на 2 м ніжэйшы за жырафу. Ці можа жырафа зазірнуць у акно другога паверха дома, калі яно размешчана на вышыні 50 дм ад зямлі?

| | |
|---|---|
| Зубр | 2 м |
| Слон | 4 м |
| Страус | 2 м 70 см |

Растлумач, як памножыць 45 на 2.

**1.** Знайдзі значэнні выразаў.

$14 \cdot 5$ $3 \cdot 16$ $4 \cdot 22$ $25 \cdot 2 - 25$

**2.** Для рамонту кватэры купілі 30 кг фарбы ў 10 аднолькавых бляшанках. Зрасходавалі 4 бляшанкі. Колькі кілаграмаў фарбы зрасходавалі?



Правообладатель Национальный институт образования

# Урок 44

**1.** Рашы задачу двума спосабамі.
Колькі метраў тканіны спатрэбіцца, каб пашыць 11 касцюмаў, калі на кожныя штаны ідзе па 2 м тканіны, а на кожны пінжак — па 3 м тканіны?

Спосаб 1




Спосаб 2




**2.** Рашы задачу двума спосабамі.
У гасцініцы 3 паверхі. На кожным паверсе 12 нумароў класа люкс і 21 нумар класа камфорт. Колькі ўсяго нумароў у гасцініцы?

**3.** Складзі задачы па выразах.

$2 \cdot 6 + 8 \cdot 6$ $(2 + 8) \cdot 6$

**4.** Знайдзі значэнні выразаў.

| | | | |
|---|---|---|---|
| 13 · 4 | 21 · 1 | 18 · 5 | 27 · 3 |
| 13 · 5 | 21 · 2 | 18 · 4 | 27 · 2 |
| 13 · 6 | 21 · 3 | 18 · 3 | 27 · 1 |

Якім можа быць наступны выраз у кожным слупку?

**5.** Састаў выразы. Знайдзі іх значэнні.

| Памяншаемае | 46 · 2 | 25 · 4 | 33 · 3 | 19 · 5 |
|---|---|---|---|---|
| Аднімаемае | 24 · 3 | 15 · 5 | 22 · 2 | 12 · 7 |



Правообладатель Национальный институт образования

**6.** Устаў прапушчаныя лікі.

14 кг · 5 + ? кг = 100 кг

23 кг · 4 + ? кг = 100 кг

? дм + 25 дм · 3 = 100 дм

? см + 31 см · 2 = 1 м

**7.** Вылічы. Вынік выразі ў гадзінах і мінутах.

45 мін – 40 мін + 79 мін

70 мін + 20 мін – 8 мін

65 мін – 64 мін + 99 мін

100 мін – 48 мін + 17 мін

**8.** Для вырабу дзвюх аднолькавых кармушак для птушак спатрэбілася 16 дм дошкі. Колькі дэцыметраў дошкі трэба для вырабу трох такіх кармушак?

**9.** Прачытай задачу. Ці можна яе рашыць? Калі нельга, то змяні ўмову так, каб задачу можна было рашыць.

Тата прынёс для паліванння агарода 10 вёдзер вады, а Мікіта — 20 л вады. Колькі ўсяго літраў вады прынеслі тата і Мікіта?

**1.** Вылічы.

80 : 20 · 16 90 : 30 · 27 100 : 20 · 18

**2.** Рашы задачу двума спосабамі.

Прадалі 12 пакетаў з чырвонай і белай цыбуляй. У кожным пакеце было па 2 кг чырвонай цыбулі і па 3 кг белай цыбулі. Знайдзі масу прададзенай цыбулі.



Правообладатель Национальный институт образования

# Урок 45

**1.** Вылічы.

| | | |
|---|---|---|
| (8 + 40) · 2 | (5 + 12) · 3 | 30 · 2 + 6 · 2 |
| (10 + 8) · 4 | (11 + 9) · 5 | 20 · 3 + 3 · 3 |

**2.** Параўнай.

| | |
|---|---|
| 8 · 4 + 8 · 3 ? 8 · (4 + 3) | (2 + 10) · 8 ? 11 · 8 |
| 3 · 6 + 5 · 6 ? (3 + 5) · 7 | (20 + 1) · 4 ? 20 · 4 |

**3.** Знайдзі значэнні выразу $(a + b) \cdot c$, калі:

| $a \cdot c$ | 29 | 13 | 0 | 10 |
|---|---|---|---|---|
| $b \cdot c$ | 61 | 45 | 10 | 1 |

**4.** Вылічы.

| | | | |
|---|---|---|---|
| 35 · 2 | 12 · 3 | 23 · 4 | 20 · 5 |
| 36 · 2 | 14 · 3 | 22 · 4 | 18 · 5 |
| 37 · 2 | 16 · 3 | 21 · 4 | 16 · 5 |

Якім можа быць наступны выраз у кожным слупку?

**5.** На пашыў сцягоў для спартыўнага свята пайшло 18 м тканіны, пароўну на кожны сцяг. Усяго пашылі 9 сцягоў. Колькі метраў тканіны пайшло на кожны сцяг?

**6.** У актавай зале школы 100 месцаў. Ці хопіць месцаў для ўсіх вучняў, калі ў залу ўвайшлі 3 класы і ў кожным класе было па 13 хлопчыкаў і 12 дзяўчынак?

**7.** Растлумач выразы. Якія выразы не спатрэбяцца для рашэння задачы?

Купілі 5 пакетаў бульбы, па 8 кг у кожным пакеце, і 3 пакеты морквы, па 4 кг у кожным пакеце. Колькі ўсяго кілаграмаў агародніны купілі?

5 + 3 | 8 · 5 | 4 · 3 | 8 + 4 | 5 – 3 | 8 – 4



Правообладатель Национальный институт образования

**8.** У шасці ўпакоўках было 60 музычных дыскаў, па-роўну ў кожнай. Колькі дыскаў было ў чатырох такіх упакоўках?

**9.** Каторая гадзіна? На якім цыферблаце стрэлкі ўтва-раюць прамы вугал? Востры вугал? Тупы вугал?



**10.** Рашы задачы.

- Знайдзі перыметр прамавугольніка з даўжынямі старон 14 см і 11 см.
- Знайдзі перыметр квадрата з даўжынёй стараны 25 дм.

**11.** Дзіма, Віця, Стэфан і Адам занялі пер-шыя чатыры месцы ў спаборніцтвах па бегу. Вызначце, якое месца заняў кожны хлопчык, калі:

- Дзіма не заняў ні першага, ні чацвёртага месца;
- Віця заняў другое месца;
- Стэфан не быў апошні.

**1.** Вылічы.

$16 \cdot 6 - 3 \cdot 17$ $(15 + 24 \cdot 3) : 1$

**2.** Купілі 4 паштовыя наборы. У кожным наборы было па 14 каляровых канвертаў і па 7 белых канвертаў. Колькі ўсяго канвертаў купілі?



Правообладатель Национальный институт образования

# Урок 46

Трое дзяцей хочуць падзяліць пароўну 18 ірысак і 12 ледзянцоў. Колькі цукерак атрымае кожнае дзіця?



**Спосаб 1**

$(18 + 12) : 3 = 30 : 3 = 10$

**Спосаб 2**

$18 : 3 + 12 : 3 = 6 + 4 = 10$

$(18 + 12) : 3 = 18 : 3 + 12 : 3$

Каб падзяліць суму на лік, можна кожнае складаемае падзяліць на гэты лік і атрыманыя вынікі скласці.

$(a + b) : c = a : c + b : c$

**1.** Вылічы рознымі спосабамі.

$(8 + 4) : 2$ $(12 + 6) : 3$ $(40 + 20) : 10$

$(5 + 15) : 5$ $(24 + 16) : 4$ $(60 + 40) : 20$

**2.** Параўнай.

$(4 + 8) : 2 \;?\; 4 : 2 + 8 : 2$ $(6 + 9) : 3 \;?\; 6 : 3 + 9 : 3$

$(15 + 5) : 5 \;?\; 15 : 5 + 5$ $12 : 3 + 9 \;?\; (12 + 9) : 3$

У якіх выпадках можна выканаць параўнанне без вылічэнняў?

**3.** Вылічы.

$27 \cdot 3$ $5 \cdot 19$ $39 \cdot 2$ $4 \cdot 13$

**4.** У кандытарскім аддзеле было 98 кг пячэння. Калі частку пячэння прадалі, засталося 5 каробак, па 7 кг пячэння ў кожнай. Колькі кілаграмаў пячэння прадалі?



Правообладатель Национальный институт образования

**5.** Складзі і рашы задачу.

| Умяшчальнасць адной каністры (л) | Колькасць каністраў (шт.) | Умяшчальнасць усіх каністраў (л) |
|---|---|---|
| аднолькавая | 4 | 80 |
| | 2 | ? |

**6.** У Яны ў 3 разы больш рублёў, чым у Алеся. Калі Яна патраціць 4 рублі, то ў яе застанецца столькі ж рублёў, колькі ў Алеся. Колькі рублёў у Яны?

Яна кажа:

Вось такая схема дапаможа даведацца, колькі ў мяне рублёў:




Алесь кажа:

Не, дапаможа вось такая схема:



Чыя праўда?

Знайдзі правільную роўнасць.

(6 + 4) : 2 = 6 : 2 + 4 (6 + 4) : 2 = 6 : 2 + 4 : 2

**1.** Знайдзі значэнні выразаў.

(60 + 20) : 2 60 : 3 + 9 : 3 27 · 2 – 18 : 3

**2.** Сашу падарылі канструктар, у якім было 65 дэталей. Саша зрабіў паравоз з 11 дэталей. З астатніх дэталей Саша зрабіў 9 вагонаў. Колькі дэталей пайшло на вагон, калі на кожны з іх спатрэбілася дэталей пароўну?



Правообладатель Национальный институт образования

# Урок 47

Як падзяліць двухзначны лік на адназначны?

1) 

36 : 3 = (30 + 6) : 3

2) 

36 : 2 = (20 + 16) : 2

1. Прадстаўляю двухзначны лік у выглядзе сумы зручных складаемых, кожнае з якіх дзеліцца на дзельнік.
2. Дзялю кожнае складаемае на адназначны лік.
3. Атрыманыя вынікі складваю.

**1.** Вылічы.

48 : 4 55 : 5 63 : 3 84 : 2

**2.** Вылічы.

57 : 3 64 : 4 72 : 6 96 : 8

**3.** Састаў выразы і знайдзі іх значэнні.

- Да дзелі лікаў 75 і 5 дадаць здабытак лікаў 3 і 13.
- Ад здабытку лікаў 5 і 20 адняць дзель лікаў 69 і 3.
- Суму лікаў 52 і 44 падзяліць на 4.
- Лік 65 падзяліць на рознасць лікаў 42 і 37.

**4.** Па якіх прыметах можна падзяліць выразы на дзве групы? Вылічы.

| | | |
|---|---|---|
| (36 – 29) · 7 | 64 : 8 · 11 | 4 · (17 + 5) + 12 |
| 5 · 16 : 40 | (24 – 12) · 2 · 3 | 48 : 6 + 5 · 10 |



Правообладатель Национальный институт образования

**5.** За 2 мін з крана выцякае 10 л вады. Колькі літраў вады можа выліцца з крана за 5 мін?

**6.** Рашы задачу рознымі спосабамі.
У навагоднім наборы 12 сініх і 14 чырвоных ёлачных шароў. Колькі шароў у трох такіх наборах?

**7.** Для пашыву сукенкі расходуюць 3 м тканіны, а для пашыву двух касцюмаў — 8 м. У швачкі ёсць 18 м тканіны. Ці можа яна пашыць з гэтай тканіны 4 сукенкі? 2 сукенкі і 3 касцюмы? 3 сукенкі і 3 касцюмы?

**8.** Вылічы перыметры прамавугольніка з даўжынямі старон 2 см і 5 см і квадрата з даўжынёй стараны 2 см.

**9.** З прамавугольніка і квадрата з задачы 8 можна скласці дзве фігуры так, як паказана на малюнках.

1

2

Знайдзі перыметры гэтых фігур.

**10.** Даўжыні звёнаў ломанай *LMNO* роўныя 12 дм, 13 дм, 14 дм. Знайдзі даўжыню гэтай ломанай.

Якой стане даўжыня ломанай *LMNO*, калі кожнае яе звяно павялічыць на 2 дм?

Растлумач, як падзяліць 48 на 2; на 3.

**1.** Вылічы.

24 : 2 66 : 6 96 : 6 75 : 5

**2.** Рашы задачу рознымі спосабамі.
У каробцы 8 вялікіх і 16 маленькіх кубікаў. Колькі кубікаў у чатырох такіх каробках?



Правообладатель Национальный институт образования

# Урок 48

**1.** Рашы задачу двума спосабамі.
У адзін акварыум трэба ўліць 24 л вады, а ў другі — 36 л. Колькі шасцілітровых вёдзер вады трэба ўліць у абодва акварыумы?

Спосаб 1




Спосаб 2




**2.** Рашы задачу рознымі спосабамі.
У бібліятэку прывезлі 64 падручнікі па матэматыцы і 32 падручнікі па прадмеце «Чалавек і свет». Усе падручнікі былі спакаваны ў пачкі, па 8 падручнікаў у кожным. Колькі пачкаў падручнікаў прывезлі?

**3.** Складзі задачы па выразах.

$12 : 2 + 8 : 2$ $(12 + 8) : 2$

**4.** Знайдзі значэнні выразаў.

| | | | |
|---|---|---|---|
| 80 : 5 | 90 : 5 | 50 : 2 | 70 : 2 |
| 72 : 2 | 72 : 3 | 72 : 4 | 72 : 6 |

**5.** Знайдзі прапушчаныя лікі. Састаў здабыткі.

| $a$ | 26 | ? | 7 | 60 | 0 | ? |
|---|---|---|---|---|---|---|
| $b$ | 2 | 4 | ? | ? | 99 | 3 |
| $a \cdot b$ | ? | 72 | 91 | 60 | ? | 84 |

**6.** Мышка за 4 г занесла ў норку 48 зярнятак. Колькі зярнятак яна зможа занесці ў норку за 2 г, калі будзе насіць па столькі ж зярнятак за гадзіну?



Правообладатель Национальный институт образования

**7.** Дапоўні задачу данымі малюнка. Рашы задачу.
Вышыня сцябла — ? см. Вусень прапоўз ад пачатку сцябла ? см, а потым вярнуўся назад на 1 см. Колькі сантыметраў засталося паўзці вусеню да верху сцябла?




**8.** Знайдзі перыметры трохвугольнікаў.



**9.** Вызнач даўжыню стараны квадрата, перыметр якога роўны перыметру прамавугольнага трохвугольніка з задачы 8.

**10.** Гадзіннік паказвае 15 г 20 мін. Вядома, што гэты гадзіннік спазняецца на 8 мін. Каторая зараз гадзіна?

**1.** Вылічы.

| | | | |
|---|---|---|---|
| 30 : 2 | 70 : 5 | 90 : 2 | 90 : 5 |

**2.** Рашы задачу рознымі спосабамі.
Для парку купілі 36 саджанцаў клёнаў і 45 саджанцаў ліп. Усе дрэвы пасадзілі ў 9 радоў, па-роўну ў кожным радзе. Па колькі дрэў пасадзілі ў кожным радзе?



Правообладатель Национальный институт образования

# Урок 49

Як падзяліць двухзначны лік на двухзначны?

$48 : 12 = ?$

$2 \cdot 12 = 24$

$3 \cdot 12 = 36$

$4 \cdot 12 = 48$

$5 \cdot 12 = 60$




1. Спрабую розныя адназначныя лікі памножыць на дзельнік.
2. Выбіраю лік, пры множанні якога на дзельнік атрымліваецца дзялімае.

**1.** Вылічы.

| | | | |
|---|---|---|---|
| 45 : 15 | 62 : 31 | 96 : 16 | 100 : 25 |
| 88 : 22 | 85 : 17 | 84 : 12 | 90 : 15 |

**2.** Адкажы на пытанні.

- У колькі разоў 14 менш за 28? 42? 70?
- На колькі 14 менш за 28? 42? 70?
- У колькі разоў 96 больш за 2? 6? 8?
- На колькі 96 больш за 2? 6? 8?

**3.** Састаў правільныя роўнасці і няроўнасці, выкарыстоўваючы выразы.

| | | | |
|---|---|---|---|
| $17 \cdot 4 - 60$ | $90 : 5 + 18$ | $64 : 8$ | $2 \cdot 18$ |

**4.** Састаў выразы і знайдзі іх значэнні.









Правообладатель Национальный институт образования

**5.** Купілі некалькі набораў з фламастарамі, па 6 фламастараў у кожным. Усяго купілі 54 фламастары. Колькі купілі набораў?

**6.** Для паездкі на экскурсію 42 хлопчыкі і 33 дзяўчынкі селі ў 3 аўтобусы, пароўну ў кожны. Колькі дзяцей апынулася ў кожным аўтобусе?

**7.** Арына і Марына ў 15 г выйшлі насустрач адна адной. Арына прайшла да сустрэчы 25 м, што ў 2 разы менш, чым прайшла Марына. Ці правільна, што паміж імі было 100 м да пачатку руху?

**8.** Выберы схему. Рашы задачу.
Тату 35 гадоў. Тата ў 5 разоў старэйшы за сына. На колькі гадоў тата старэйшы за сына?




На колькі гадоў тата будзе старэйшы за сына праз 10 гадоў?

**9.** Знайдзіце тры лікі, здабытак якіх роўны іх суме.

Як падзяліць 45 на 15?

**1.** Вылічы.
84 : 21 65 : 13 78 : 26 87 : 29

**2.** Маса скрыні з абрыкосамі — 12 кг, а скрыні з персікамі — на 24 кг большая. У колькі разоў скрыня з персікамі цяжэйшая за скрыню з абрыкосамі?



Правообладатель Национальный институт образования

# Урок 50

**1.** Вылічы.

| | | |
|---|---|---|
| 80 : 16 | 70 : 35 · 41 | 68 : 17 · 10 |
| 30 : 15 | 60 : 12 · 13 | 42 : 14 · 10 |
| 50 : 25 | 60 : 15 · 12 | 96 : 12 · 10 |

**2.** Устаў прапушчаныя лікі, каб роўнасці былі правільныя.

(56 + 24) : 8 = 7 + ?

(42 + 36) : ? = 7 + 6

(11 + 23) · 2 = ? + 46

(18 + 27) : 3 = 18 : ? + 27 : ?

(24 + 60) : 12 = ? : 12 + ? : 12

(14 + 19) · 3 = 14 · ? + ? · 3

**3.** Вылічы.

| | | |
|---|---|---|
| 48 + 39 + 2 | 28 + 29 · 1 | 28 – (15 + 25) : 20 |
| 7 · 8 : 7 : 8 | (9 · 7) · 0 + 24 | 60 : 30 + 4 · 7 |

**4.** Параўнай.

| | |
|---|---|
| 10 дм ? 2 дм + 70 см | 1 м ? 71 см + 19 см |
| 1 м ? 5 дм + 5 дм | 4 дм ? 85 см – 35 см |

**5.** У гасцініцы для жывёлы купілі 60 кг сухога корму для дарослых сабак і 30 кг сухога корму для шчанят. Увесь корм быў расфасаваны ў пакеты, па 15 кг у кожны. Колькі ўсяго пакетаў з кормам купілі?

**6.** У святочным прадстаўленні ўдзельнічалі 48 цыркавых артыстаў — гімнастаў, акрабатаў і жанглёраў. Гімнастаў было 28, а акрабатаў і жанглёраў — паровну. Колькі акрабатаў удзельнічалі ў прадстаўленні?



Правообладатель Национальный институт образования

**7.** Складзі задачу. Запішы рашэнне выразам. Знайдзі адказ, калі $b$ роўна 30; 45; 60.

| Ледзянцоў у адным пакеце | Колькасць пакетаў | Ледзянцоў ва ўсіх пакетах |
|---|---|---|
| 15 | ? | $b$ |

**8.** У бабулі тры ўнукі і адна ўнучка. Бабуля купіла на Новы год для ўсіх дзяцей па 8 мандарынаў і па 13 грэцкіх арэхаў. Колькі ўсяго мандарынаў і арэхаў купіла бабуля?

**9.** У табліцы паказана, колькі дзясяткаў гузікаў розных колераў ёсць у майстэрні па рамонце адзення. Запішы рашэнне выразам са зменнай. Рашы задачу. У майстэрні было ? чырвоных гузікаў, ? шэрых і ? зялёных. Калі частку гузікаў выкарысталі, засталося 27 гузікаў. Колькі гузікаў выкарысталі?



**1.** Вылічы.

$65 : (46 - 33) \cdot 10$ $\qquad$ $99 : 33 + 70 : 10$

**2.** Прадалі 96 кг пячэння і вафель. Пячэння прадалі 24 кг. У колькі разоў больш прадалі кілаграмаў вафель, чым пячэння?



Правообладатель Национальный институт образования

# Урок 51

**1.** Параўнай.

(36 + 28) : 4 ? 36 : 4 + 28 : 4
(60 + 40) : 10 ? 60 : 10 + 40
70 : 7 + 21 : 3 ? (70 + 21) : 7
10 · 3 + 16 · 3 ? (16 + 10) · 3

**2.** Вылічы.

| | | | |
|---|---|---|---|
| 84 : 7 | 64 : 2 | 96 : 24 | 100 : 10 |
| 84 : 3 | 64 : 4 | 96 : 48 | 100 : 25 |
| 84 : 2 | 64 : 8 | 96 : 96 | 100 : 50 |

Чым падобныя і чым адрозніваюцца выразы ў кожным слупку?

**3.** Знайдзі значэнні выразаў.

| | | | |
|---|---|---|---|
| 98 : 2 | 84 : 4 | 96 : 3 | 36 : 2 |
| 98 : 49 | 84 : 21 | 96 : 32 | 36 : 18 |

**4.** Састаў выразы і знайдзі іх значэнні.

| Памяншаемае | 100 | 100 | 6 · 13 | 19 · 2 |
|---|---|---|---|---|
| Аднімаемае | 3 · 19 | 4 · 18 | 8 · 7 | 3 · 11 |

**5.** Вылічы. Вынік выразі ў гадзінах і мінутах.

100 мін – 39 мін
40 мін + 36 мін
100 мін – 21 мін – 14 мін
25 мін + 49 мін + 26 мін

**6.** Устаў прапушчаныя лікі, каб роўнасці былі правільныя.

64 + ? = 92 ? – 15 = 49 100 – ? = 36

**7.** Запішы ў слупок. Вылічы.

29 + 58 47 + 53 71 – 25 100 – 36



Правообладатель Национальный институт образования

**8.** Па некалькі кубкаў было ў сямі аднолькавых сервізах, усяго 42 кубкі. Колькі кубкаў было ў адным сервізе?

**9.** Для прадстаўлення ў цырку атлеты падрыхтавалі 5 пудовых гір. Маса ўсіх гэтых гір складала 80 кг. Для свайго нумара атлет узяў дзве пудовыя гіры. Якая маса гэтых дзвюх гір?

**10.** Дапоўні задачу значэннямі даўжыні, якія падыходзяць. Рашы задачу.

Дарожка ідзе ад дома да студні, ад студні — да альтанкі, ад альтанкі — да дома. Даўжыня дарожкі ад дома да студні — ?, ад студні да альтанкі — ?, ад дома да альтанкі — ?. Якая даўжыня ўсёй дарожкі?



| | |
|---|---|
| 1 м | 32 м |
| 20 м | 5 дм |
| 40 см | 25 м |

**11.** Даўжыня стараны квадрата *ABCD* роўная 16 см. Прамавугольнік *KLMN* мае такі ж перыметр, як і квадрат *ABCD*. Знайдзі даўжыню адной стараны прамавугольніка, калі даўжыня яго другой стараны — 2 дм.

**1.** Вылічы.

(82 – 16) : 22 100 – 51 : 3 45 : 15 · 29

**2.** Для дзіцячага свята ў зале расставілі 42 крэслы ў 3 рады, пароўну ў кожны. Потым у кожны рад паставілі яшчэ па 2 крэслы. Колькі ўсяго крэсел паставілі?



Правообладатель Национальный институт образования

# Урок 52

Палова, або адна другая частка, шакаладкі.

Трэць, або адна трэцяя частка, шакаладкі.



Чвэрць, або адна чацвёртая частка, шакаладкі.

У запісах віду

$\frac{1}{2}, \frac{1}{3}, \frac{1}{4}, \ldots$

лік, запісаны пад лініяй, абазначае,
на колькі роўных частак падзялілі;
лік, запісаны над лініяй, абазначае,
колькі такіх частак узялі.

**1.** Якая частка фігуры не зафарбавана?



**2.** Вылічы.

17 · (53 – 50) : 1
100 : (100 – 75) + 10
(38 + 37) : 5 + 62

12 · (6 + 4 : 4)
64 : (52 + 72 : 6)
80 : (16 + 0 : 14)



Правообладатель Национальный институт образования

**3.** Расстаў дужкі так, каб роўнасці былі правільныя.
$5 + 3 \cdot 8 - 4 = 60$ $5 + 3 \cdot 8 - 4 = 17$

**4.** Складзі і рашы задачу.

| Зрабіў за 1 гадзіну (шт.) | Час працы (г) | Усяго зрабіў (шт.) |
|---|---|---|
| аднолькава | 7 | ? |
| | 2 | 18 |

**5.** Купілі 12 м чырвонай і 20 м жоўтай тасьмы для ўпрыгожвання 9 абрусаў. Ці хопіць гэтай тасьмы, калі на кожны абрус ідзе 4 м тасьмы?

**6.** Начарці ломаную *LMNO*, у якой даўжыня звяна *LM* роўная 2 см, даўжыня звяна *MN* — 3 см, а даўжыня звяна *NO* — суме даўжынь звёнаў *LM* і *MN*.

**7.** Маса адной лялькі і аднаго плюшавага мядзведзя разам роўная 3 кг, а маса чатырох такіх лялек і трох такіх мядзведзяў — 10 кг. Знайдзі масу адной лялькі і масу аднаго мядзведзя.

Выберы схему, на якой выдзелена адна пятая частка адрэзка.

1

2

**1.** Знайдзі значэнні выразаў.
$5 \cdot 12 : 4 + 11$ $(77 - 34 : 2) : 15$

**2.** Начарці ломаную *ABCD*, у якой даўжыня звяна *AB* — 3 см, даўжыня звяна *BC* — у 2 разы большая за даўжыню звяна *AB*, а даўжыня звяна *CD* — 2 см.



Правообладатель Национальный институт образования

# Урок 53

Разгледзь, як разрэзалі на роўныя часткі тры аднолькавыя пірагі.

Што больш — палова пірага або трэць пірага?
Што менш — чвэрць пірага або палова пірага?
Што больш — трэць пірага або чвэрць пірага?

**1.** Дапоўні словамі «больш за» або «менш за» запісы, каб яны былі правільныя.

$\frac{1}{2}$ адрэзка … $\frac{1}{3}$ адрэзка

$\frac{1}{5}$ адрэзка … $\frac{1}{4}$ адрэзка

$\frac{1}{3}$ адрэзка … $\frac{1}{5}$ адрэзка

$\frac{1}{2}$ адрэзка … $\frac{1}{4}$ адрэзка

**2.** Параўнай.

$(52 + 36) : 8 \;?\; 8$
$100 - 14 \cdot 6 \;?\; 20$
$(24 + 16) : 20 \;?\; 2$
$95 \;?\; 100 - (90 - 9) \cdot 1$
$81 \;?\; 72 : 24 \cdot 27$
$100 \;?\; (93 - 87) \cdot 16$



Правообладатель Национальный институт образования

**3.** Састаў выразы і знайдзі іх значэнні.

| $c$ | 4 | 1 | 6 | 8 | 10 | 0 |
|---|---|---|---|---|---|---|
| $c \cdot 6 + 29$ | ? | ? | ? | ? | ? | ? |

**4.** Вылічы.

3 дм 4 см + 5 дм 3 см  7 дм 6 см + 22 см

**5.** Складзі задачу. Запішы рашэнне выразам са зменнай. Знайдзі адказ, калі $a$ роўна 3; 9; 21.

| Кніг у адным рукзаку | Колькасць рукзакоў | Усяго кніг |
|---|---|---|
| аднолькава | 18 | 72 |
| | $a$ | ? |

**6.** Выберы схему. Рашы задачу.

У Федзі 17 машынак. Калі ён падорыць брату Максіму 2 машынкі, то ў іх стане машынак пароўну. Колькі машынак у Максіма зараз?

1




2

Што больш — адна другая частка круга або адна чацвёртая частка гэтага круга?

**1.** Знайдзі значэнні выразаў.

(18 · 1 + 42) : 20  88 : (17 · 4 – 46)

**2.** У ба́ку было 82 л вады. Спачатку зрасходавалі 12 л, а потым узялі яшчэ 3 васьмілітровыя вядры вады. Колькі літраў вады засталося ў баку?



Правообладатель Национальный институт образования

# Урок 54

Было 6 кубікаў. Узялі $\frac{1}{3}$ частку кубікаў. Колькі кубікаў узялі?

$\frac{1}{3}$ частка кубікаў

- Трэба знайсці адну трэцюю частку ўсіх кубікаў.
- Усяго кубікаў 6.
- Для рашэння задачы трэба 6 падзяліць на 3.

**1.** У класе 24 вучні. Адна чацвёртая частка ўсіх вучняў займаецца тэнісам. Колькі вучняў займаюцца тэнісам?




**2.** На колькі частак падзелены кожны круг? Ці можна для кожнага круга назваць, якая яго частка зафарбавана?




З дапамогай малюнка дапоўні словамі «больш за» або «менш за» запісы так, каб яны былі правільныя.

$\frac{1}{2}$ круга ... $\frac{1}{3}$ круга

$\frac{1}{8}$ круга ... $\frac{1}{4}$ круга

$\frac{1}{4}$ круга ... $\frac{1}{2}$ круга

$\frac{1}{3}$ круга ... $\frac{1}{8}$ круга

**3.** Знайдзі значэнні выразаў, калі $b$ роўна 2; 4.

$24 : b + 80 : b$

$b \cdot 24 - 64 : b$

$1 \cdot b + 100 : b$



Правообладатель Национальный институт образования

**4.** Расстаў дужкі так, каб роўнасці былі правільныя.
78 – 60 : 2 + 4 = 13 78 – 60 : 2 + 4 = 44

**5.** Выберы пытанне і рашы задачу.
Сцяпан ідзе ад дома да школы 8 мін. Гэта ў 3 разы менш, чым час, затрачаны на шлях ад школы да парку.

- Колькі мінут трэба затраціць Сцяпану, каб дайсці ад дома да школы і вярнуцца назад?
- На колькі мінут больш трэба затраціць Сцяпану на шлях ад школы да парку, чым ад школы да дома?
- Колькі мінут займае шлях ад дома да магазіна і назад?

**6.** Ці правільнае сцвярджэнне, што перыметр пяцівугольніка *ABCDM* роўны адной другой частцы дэцыметра?




Было 8 сліў. З'елі чвэрць сліў. Колькі сліў з'елі?

**1.** Састаў выразы і знайдзі іх значэнні.

| Памяншаемае | 13 · 7 | 96 : 4 | 60 : 5 | 20 · 5 |
|---|---|---|---|---|
| Аднімаемае | 45 : 15 | 80 : 20 | 76 : 19 | 99 : 9 |

**2.** Валянцін прабег 80 м, а яго малодшы брат — $\frac{1}{8}$ частку гэтай дыстанцыі. Колькі метраў прабег малодшы брат Валянціна?



Правообладатель Национальный институт образования

# Урок 55

Тры зялёныя кубікі складаюць $\frac{1}{2}$ частку ўсіх кубікаў. Колькі ўсяго кубікаў?

$\frac{1}{2}$ частка кубікаў

- Адна другая частка кубікаў — гэта 3 кубікі.
- Значыць, у дзвюх такіх частках будзе 2 разы па 3 кубікі.
- Для рашэння задачы трэба 3 памножыць на 2.

**1.** Адна пятая частка ўсіх дрэў у садзе — гэта 8 груш. Колькі ўсяго дрэў у садзе?




**2.** У букеце 15 гваздзікоў. Чырвоныя гваздзікі складаюць $\frac{1}{3}$ частку ўсіх гваздзікоў у букеце. Колькі ў букеце чырвоных гваздзікоў?

**3.** Устаў прапушчаныя лікі, каб роўнасці былі правільныя.

| | | |
|---|---|---|
| 2 · ? = 38 | 23 · ? = 92 | ? · 4 = 80 |
| 30 : ? = 15 | 99 : ? = 9 | ? : 25 = 4 |

**4.** Устаў прапушчаныя лікі.

| | | |
|---|---|---|
| $\frac{1}{2}$ дм = ? см | $\frac{1}{4}$ г = ? мін | $\frac{1}{5}$ м = ? см |

**5.** Запішы ў слупок. Вылічы. Выканай праверку.

29 + 58 47 + 53 71 – 25 100 – 36

**6.** Навагоднія шары расклалі ў 8 каробак, па 4 шары ў кожную. Колькі ўсяго шароў расклалі?



Правообладатель Национальный институт образования

**7.** Шэсць турыстаў плылі на дзвюх байдарках 4 дні, потым столькі ж дзён ехалі на роварах. Кожны дзень турысты адпачывалі днём па 2 гадзіны. Колькі гадзін яны затрацілі на дзённы адпачынак за ўвесь паход?

**8.** Дапоўні задачу данымі табліцы. Рашы задачу.
Цімур у гуртку робататэхнікі зрабіў ? аднолькавых робатаў. Яму спатрэбілася для гэтага ? дэталей. Колькі дэталей спатрэбіцца яго брату Артуру, каб зрабіць ? такіх робатаў?

| | Колькасць дэталей для 1 робата | Колькасць робатаў | Усяго дэталей |
|---|---|---|---|
| Цімур | аднолькавая | 2 | 46 |
| Артур | | 3 | ? |

**9.** Пятая частка даўжыні адрэзка *AB* роўная 2 см. Знайдзі даўжыню адрэзка *AB*. Начарці гэты адрэзак.

Трэць даўжыні дарожкі — 3 м. Як знайсці даўжыню ўсёй дарожкі?

**1.** Састаў выразы і знайдзі іх значэнні.

| Складаемае | 21 · 4 | 17 · 5 | 25 · 3 | 19 · 4 |
|---|---|---|---|---|
| Складаемае | 75 : 15 | 96 : 16 | 100 : 5 | 72 : 6 |

**2.** У супермаркет прывезлі 9 каробак з шакаладным марожаным. Гэта $\frac{1}{5}$ частка ўсіх каробак з марожаным, якія прывезлі. Колькі ўсяго каробак з марожаным прывезлі ў супермаркет?



Правообладатель Национальный институт образования

# Урок 56

**1.** Кузьма сарваў 66 вішань. Шостую частку ўсіх сарваных вішань ён з'еў. Колькі вішань з'еў Кузьма?

**2.** Выберы схему. Рашы задачу.

У кошыку 5 баравікоў. Гэта $\frac{1}{3}$ частка ўсіх грыбоў у кошыку. Колькі ўсяго грыбоў у кошыку?

1




2




3




4




**3.** Начарці адрэзак даўжынёй 12 см. Начарці адзін пад адным адрэзкі, роўныя $\frac{1}{2}$ гэтага адрэзка, $\frac{1}{3}$ гэтага адрэзка, $\frac{1}{4}$ гэтага адрэзка, $\frac{1}{6}$ гэтага адрэзка.

**4.** Параўнай даўжыні адрэзкаў з задання 3. Ці правільныя сцвярджэнні:

- палова адрэзка меншая за трэць гэтага адрэзка;
- чвэрць адрэзка большая за шостую частку гэтага адрэзка;
- трэць адрэзка большая за палову адрэзка?

**5.** Параўнай.

| | |
|---|---|
| 16 · 6 ? 100 : 2 | 72 см : 6 ? 72 см : 4 |
| 15 · 5 ? 100 : 4 | 12 см · 2 ? 12 см · 5 |
| 14 · 4 ? 100 : 5 | 48 см : 2 ? 54 см : 2 |

У якіх выпадках можна выканаць параўнанне без вылічэнняў?

Правообладатель Национальный институт образования

**6.** Састаў выразы і знайдзі іх значэнні.




**7.** З двух вагонаў выйшлі 54 пасажыры. Шостая частка гэтых пасажыраў выйшла з другога вагона. Колькі пасажыраў выйшлі з першага вагона?

**8.** Рашы задачу двума спосабамі.
Настаўніца раздала 36 простых алоўкаў і 54 каляровыя алоўкі 18 вучням пароўну. Колькі алоўкаў атрымаў кожны вучань?

**9.** У Яны 6 рублёў. Гэта $\frac{1}{3}$ частка грошай, якія ёсць у Алеся.

Яна кажа:

Калі да шостай часткі маіх грошай дадаць шостую частку грошай Алеся, то мы зможам купіць дзве порцыі марожанага па 2 рублі.

Ці праўду кажа Яна?

**1.** Параўнай.
54 : 6 · 7 ? 54 : 9 · 7
21 : 7 · (6 : 2) ? 21 : 7 · 6 : 2

**2.** На дзвюх паліцах 36 кніг. Адна чацвёртая частка гэтых кніг стаіць на першай паліцы. Колькі кніг стаіць на другой паліцы?



Правообладатель Национальный институт образования

# Урок 57

| | | |
|---|---|---|
| 30 + ? = 35 | 30 + $x$ = 35 | $x$, $y$ — лацінскія літары. |
| ? · 6 = 54 | $y$ · 6 = 54 | $x$ — чытаем «ікс». |
| 99 – ? = 80 | 99 – $x$ = 80 | $y$ — чытаем «ігрэк». |

**Ураўненне** — гэта роўнасць са зменнай. Рашыць ураўненне — значыць знайсці значэнне зменнай, пры якім роўнасць будзе правільная.

**1.** Знайдзі і прачытай ураўненні.

| | | |
|---|---|---|
| 36 + 18 = 54 | 21 + 46 | $y$ – 99 = 1 |
| $a$ · 8 = 72 | $b$ : 6 = 11 | $m$ – 11 |
| 81 : 9 = 9 | $c$ · 32 | $x$ – 35 = 27 |

**2.** Састаў ураўненні па ўзоры.




$x$ + 8 = 20
8 + $x$ = 20
20 – $x$ = 8







**3.** Падбяры значэнні зменных, пры якіх роўнасці будуць правільныя.

| | | |
|---|---|---|
| 25 + $a$ = 50 | 100 – $x$ = 42 | $y$ – 0 = 27 |

**4.** Падбяры значэнні зменных, пры якіх роўнасці будуць правільныя.

| | | |
|---|---|---|
| $c$ · 9 = 63 | $y$ : 1 = 6 | 28 : $x$ = 4 |

**5.** Вылічы ў слупок. Выканай праверку.

| | | |
|---|---|---|
| 35 + 54 | 67 + 25 | 37 + 22 |
| 81 – 44 | 63 – 17 | 96 – 18 |



Правообладатель Национальный институт образования

**6.** Дапоўні задачу данымі табліцы. Рашы задачу.
У магазін «Школьнік» прывезлі ? пачкаў з альбомамі для малявання і ? пачкаў з альбомамі для чарчэння. Альбомаў для малявання прывезлі ?. Колькі прывезлі альбомаў для чарчэння, калі ў кожным пачку была аднолькавая колькасць альбомаў?

| Альбомаў у адным пачку | Колькасць пачкаў | Альбомаў ва ўсіх пачках |
|---|---|---|
| аднолькава | 16 | 96 |
| | 14 | ? |

**7.** У атэлье было 48 маткоў шарсцяных нітак. З трэцяй часткі нітак звязалі шалікі. Колькі шалікаў звязалі, калі на кожны пайшло 2 маткі нітак?

**8.** Начарці ломаную, даўжыня якой вылічваецца так:

$4 \text{ см} \cdot 2 + 2 \text{ см} \cdot 3$

**9.** Ігар з дапамогай палачак даўжынёй 5 см выклаў квадрат з даўжынёй стараны 20 см і падзяліў яго на роўныя квадрацікі з даўжынёй стараны 5 см. Колькі ўсяго такіх палачак спатрэбілася Ігару?

Выберы запіс, які з'яўляецца ўраўненнем.

$a + 15$ $\quad$ $a + 15 = 27$ $\quad$ $12 + 15 = 27$

**1.** Знайдзі значэнні выразаў.

$16 \cdot 5 - 36$ $\quad$ $84 : 7 + 80 : 5$ $\quad$ $90 : (47 - 29) \cdot 11$

**2.** Дачцэ 12 гадоў. Яе ўзрост складае адну трэцюю частку ўзросту мамы. Мама маладзейшая за тату на 4 гады. Колькі гадоў тату?



Правообладатель Национальный институт образования

# Урок 58

$12 + x = 31$
$x = 31 - 12$
$\underline{x = 19}$
$12 + 19 = 31$
$31 = 31$




- Невядомы лік $x$ — гэта складаемае.
- Каб знайсці невядомае складаемае, трэба ад сумы адняць вядомае складаемае.
- Ад 31 аднімаю 12, атрымліваю 19.

$72 - y = 55$
$y = 72 - 55$
$\underline{y = 17}$
$72 - 17 = 55$
$55 = 55$




- Невядомы лік $y$ — гэта аднімаемае.
- Каб знайсці невядомае аднімаемае, трэба ад памяншаемага адняць рознасць.
- Ад 72 аднімаю 55, атрымліваю 17.

$c - 26 = 64$
$c = 64 + 26$
$\underline{c = 90}$
$90 - 26 = 64$
$64 = 64$




- Невядомы лік $c$ — гэта памяншаемае.
- Каб знайсці невядомае памяншаемае, трэба да рознасці дадаць аднімаемае.
- Да 64 дадаю 26, атрымліваю 90.

**1.** Рашы ўраўненні.

$25 + x = 30$ $\quad$ $c + 32 = 76$ $\quad$ $y + 39 = 100$
$98 - y = 40$ $\quad$ $b - 18 = 35$ $\quad$ $100 - x = 64$



Правообладатель Национальный институт образования

**2.** Параўнай.

$\frac{1}{4}$ ад 64 см ? $\frac{1}{5}$ ад 70 см  $\frac{1}{2}$ ад 60 л ? $\frac{1}{3}$ ад 60 л

$\frac{1}{7}$ ад 84 кг ? $\frac{1}{6}$ ад 96 кг  $\frac{1}{4}$ ад 48 г ? $\frac{1}{4}$ ад 96 г

**3.** Люда можа праплысці ў басейне без перапынку 25 м. Гэта трэцяя частка таго, што можа праплысці без перапынку Гена. На колькі больш метраў можа праплысці без перапынку Гена, чым Люда?

**4.** Дапоўні ўмову задачы данымі табліцы. Рашы задачу. Даўжыня дэльфіна складае $\frac{1}{9}$ частку даўжыні кіта. Знайдзі даўжыню кіта.

| | |
|---|---|
| Морж | 4 м |
| Дэльфін | 3 м |
| Цюлень | 3 м |

**5.** Рабочы ў магазіне можа перавезці на цялежцы не больш за 100 кг грузу. Маса пяці ўпаковак з пральным парашком роўная 60 кг. Ці зможа рабочы перавезці на цялежцы 7 такіх упаковак?

Як знайсці значэнне зменнай ва ўраўненнях?

$36 + c = 90$  $54 - x = 12$  $a - 28 = 63$

**1.** Рашы ўраўненні.

$x + 3 = 18$  $48 - y = 37$  $c - 79 = 21$

**2.** Для лыжнага шасцідзённага паходу закупілі 4 упакоўкі бляшанак з кансервамі, па 16 бляшанак у кожнай упакоўцы. Кожны дзень лыжнікі расходавалі па 10 бляшанак. Колькі бляшанак з кансервамі засталося пасля паходу?



Правообладатель Национальный институт образования

# Урок 59

$x \cdot 6 = 48$
$x = 48 : 6$
$x = 8$
$8 \cdot 6 = 48$
$48 = 48$




- Невядомы лік $x$ — гэта множнік.
- Каб знайсці невядомы множнік, трэба здабытак падзяліць на вядомы множнік.
- Дзялю 48 на 6, атрымліваю 8.

$54 : c = 9$
$c = 54 : 9$
$c = 6$
$54 : 6 = 9$
$9 = 9$




- Невядомы лік $c$ — гэта дзельнік.
- Каб знайсці невядомы дзельнік, трэба дзялімае падзяліць на дзель.
- Дзялю 54 на 9, атрымліваю 6.

$y : 3 = 7$
$y = 7 \cdot 3$
$y = 21$
$21 : 3 = 7$
$7 = 7$




- Невядомы лік $y$ — гэта дзялімае.
- Каб знайсці невядомае дзялімае, трэба дзель памножыць на дзельнік.
- Множу 7 на 3, атрымліваю 21.

**1.** Рашы ўраўненні.

$5 \cdot x = 95$ $\quad y : 16 = 6$ $\quad 64 : a = 16$



Правообладатель Национальный институт образования

**2.** Пастаў дужкі так, каб роўнасці былі правільныя.

25 + 16 – 4 = 37 43 – 20 – 7 = 30

У якой роўнасці дужкі можна не ставіць?

**3.** Выберы схему. Рашы задачу.

У маленькім наборы было 12 пірожных, што ў 3 разы менш, чым у вялікім наборы. На колькі больш было пірожных у вялікім наборы, чым у маленькім?




**4.** Выберы лікі, якімі можна дапоўніць умову задачы. Рашы задачу.

У паходзе тата нёс рукзак масай ? кг. Мамін рукзак быў у ? разы лягчэйшы за татаў. Маса рукзака Ігната была роўная ? кг. Знайдзі масу ўсіх рукзакоў.

24 4 3 100 63

Як знайсці невядомы множнік? Невядомае дзялімае? Невядомы дзельнік?

**1.** Рашы ўраўненні.

48 : $x$ = 12 $a \cdot 13 = 65$ $c : 7 = 13$

**2.** У бочцы 50 л вады. Для паліванне агарода ўзялі 4 аднолькавыя вядры вады. Пасля гэтага ў бочцы засталося 18 л вады. Колькі літраў вады змяшчаецца ў адным вядры?



Правообладатель Национальный институт образования

# Урок 60

**1.** Рашы ўраўненні.

$63 + x = 80$ $\quad$ $54 - y = 28$ $\quad$ $m - 12 = 80$

$8 \cdot n = 96$ $\quad$ $72 : t = 36$ $\quad$ $y : 7 = 10$

**2.** Устаў прапушчаны знак «+» або «–». Запішы атрыманыя ўраўненні. Рашы іх.

$x$ ? $15 = 42$ $\quad$ $y$ ? $26 = 54$ $\quad$ $4$ ? $x = 36$

**3.** Састаў выразы і знайдзі іх значэнні.

| Дзялімае | 53 + 47 | 70 | 100 – 16 | 8 · 10 |
|---|---|---|---|---|
| Дзельнік | 25 | 64 – 54 | 6 · 7 | 48 : 3 |

**4.** Выберы схему. Рашы задачу.

У Міраслава ў 5 разоў больш алоўкаў, чым у Валеры, і на 20 алоўкаў больш, чым у Валеры. Колькі алоўкаў у Міраслава?




**5.** У першым вагоне трамвая ў 4 разы больш пасажыраў, чым у другім, і на 12 пасажыраў больш, чым у другім. Колькі пасажыраў у першым вагоне трамвая?

**6.** Маме 35 гадоў. Мама на 29 гадоў маладзейшая за бабулю. Колькі гадоў унуку, калі яго ўзрост складае $\frac{1}{8}$ частку ўзросту бабулі?



Правообладатель Национальный институт образования

**7.** Ці правільна, што перыметр квадрата з даўжынёй стараны 12 см меншы за перыметр прамавугольніка з даўжынямі старон 8 см і 10 см?

**8.** У табліцы кожная зафарбаваная клетка абазначае 5 мін часу.

| | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| «Прагноз надвор'я» | | | | | | | | | | | |
| «Навіны» | | | | | | | | | | | |
| Мультфільм | | | | | | | | | | | |
| «Калыханка» | | | | | | | | | | | |

Яна кажа:

Працягласць перадачы «Прагноз надвор'я» — 10 мін, яна роўная адной пятай частцы працягласці мультфільма.

Алесь кажа:

Працягласць перадачы «Калыханка» — 3 мін, яна роўная адной трэцяй частцы працягласці мультфільма.

Чыя праўда?

**1.** Рашы ўраўненні.

$45 + x = 91$ $\quad y - 63 = 17$

$a \cdot 10 = 100$ $\quad 84 : b = 6$

**2.** Першая чарапаха прапаўзла ў 3 разы больш метраў, чым другая, і на 26 м больш, чым другая. На колькі больш метраў прапаўзла першая чарапаха, чым другая?



Правообладатель Национальный институт образования

# Урок 61

Растлумач, як можна начарціць прамавугольнік на аркушы паперы ў клетку.

1 

2 

3 

Растлумач, як можна начарціць прамавугольнік на аркушы паперы без клетак.

1 

2 

3 

**1.** Начарці ў сшытку такі прамавугольнік. Правядзі ў ім адрэзак так, каб прамавугольнік падзяліўся на дзве роўныя часткі.



Ці можна гэты прамавугольнік падзяліць на тры роўныя часткі? На чатыры роўныя часткі?

**2.** Начарці прамавугольнік на аркушы паперы без клетак. Правядзі адрэзак так, каб прамавугольнік падзяліўся на чатырохвугольнік і трохвугольнік.

**3.** Падбяры лікі, пры якіх няроўнасці будуць правільныя.

42 + ? < 45 51 < 56 – ? 40 > ? + 37



Правообладатель Национальный институт образования

**4.** Састаў і рашы ўраўненні.
- Да ліку 34 дадалі невядомы лік і атрымалі 83.
- Невядомы лік паменшылі на 19 і атрымалі 27.
- Лік 25 памножылі на невядомы лік і атрымалі 75.
- Невядомы лік падзялілі на 14 і атрымалі 7.

**5.** Даўжыня прамавугольніка *MNOP* у 3 разы большая за яго шырыню. Шырыня прамавугольніка *MNOP* на 18 см меншая за яго даўжыню. Знайдзі даўжыні старон гэтага прамавугольніка. Вылічы яго перыметр.

**6.** Растлумач, што абазначаюць выразы.
Віця зрабіў 5 вялікіх крокаў, па $a$ см кожны, і 8 маленькіх крокаў, па $b$ см кожны.

$b \cdot 8$ $a \cdot 5$ $b - a$ $a \cdot 5 + b \cdot 8$

**7.** У двух пачках было 56 аркушаў паперы. Калі з першага пачка ўзялі 10 аркушаў, у ім засталося 14 аркушаў. Колькі аркушаў паперы засталося ў другім пачку, калі з яго ўзялі 1 аркуш?

Закончы сказ: «Прамавугольнік — гэта чатырохвугольнік, у якога...»

**1.** Вылічы.
$(84 + 12 \cdot 1) : 32$ $39 + 68 : 2 : 17$

**2.** За 4 г язды на аўтамабілі было патрачана 44 л бензіну. Колькі літраў бензіну спатрэбіцца на васьмігадзінную паездку на аўтамабілі?



Правообладатель Национальный институт образования

# Урок 62

Як начарціць прамавугольнік з даўжынямі старон 8 см і 4 см?




**1.** Начарці ў сшытку прамавугольнік з даўжынямі старон 6 см і 4 см па ўзоры. Вылічы перыметр прамавугольніка.




**2.** Састаў і рашы ўраўненні.

**3.** Знайдзі значэнні выразаў.

| | |
|---|---|
| (12 + 21) · 3 | (64 + 24) : 4 |
| 12 · 3 + 21 · 3 | 64 : 4 – 24 : 4 |
| 3 · (12 + 21) | (24 + 64) : 4 |
| 12 · 3 + 21 : 3 | 64 : 4 + 24 : 4 |

Які выраз лішні ў кожным слупку?

Правообладатель Национальный институт образования

**4.** Знайдзі значэнні выразу 21 + $a$ : 13, калі $a$ роўна 52; 78; 91.

**5.** Выберы малюнак. Рашы задачу.
Адна другая частка перыметра прамавугольніка *ABCD* роўная 12 дм. Даўжыня гэтага прамавугольніка ў 3 разы большая за яго шырыню. Знайдзі даўжыні старон прамавугольніка.

1

2

3

**6.** На дзвюх паліцах было 47 цацак. Калі з адной паліцы знялі 18 цацак, на ёй засталося ў 3 разы менш цацак, чым знялі. Колькі цацак было на кожнай паліцы?

**7.** Складзі і рашы задачу.

| Маса аднаго пакета (кг) | Колькасць пакетаў (шт.) | Маса ўсіх пакетаў (кг) |
|---|---|---|
| аднолькавая | 5 | ? |
| | 4 | 64 |

Дапоўні сказ: «Каб начарціць прамавугольнік, трэба памятаць, што ўсе вуглы прамавугольніка — ..., а яго супрацьлеглыя сторны...»

**1.** Рашы ўраўненні.
13 · $m$ = 65 $n$ : 8 = 12 100 : $k$ = 10

**2.** Начарці прамавугольнік *KLMN* з даўжынямі старон 4 см і 3 см. Вылічы яго перыметр.



Правообладатель Национальный институт образования

## Урокі 63–65

**1.** Вылічы.

| | | | |
|---|---|---|---|
| 19 · 4 | 24 · 3 | 13 · 7 | 3 · 27 |
| 76 : 4 | 90 : 2 | 65 : 5 | 84 : 6 |
| 88 : 22 | 75 : 25 | 96 : 16 | 72 : 24 |

**2.** Знайдзі значэнні выразаў.

| | | |
|---|---|---|
| 9 · 1 | 46 · 1 | 15 · 1 : 1 |
| 9 : 9 | 46 : 1 | 24 : 1 · 1 |
| 9 : 1 | 46 : 46 | 28 : 28 · 0 |

**3.** Знайдзі значэнні выразаў.

| | | | |
|---|---|---|---|
| 10 · 4 | 40 : 4 | 40 : 10 | 4 · 10 |
| 3 · 20 | 20 · 3 | 60 : 20 | 60 : 3 |
| 2 · 40 | 90 : 9 | 80 : 40 | 50 · 2 |

**4.** Запішы выразы і знайдзі іх значэнні.

- Суму лікаў 34 і 46 падзяліць на 5.
- Да ліку 16 дадаць здабытак лікаў 18 і 4.
- Да дзелі лікаў 84 і 3 дадаць здабытак лікаў 99 і 0.
- Ад сумы лікаў 31 і 49 адняць дзель лікаў 45 і 15.

**5.** Вылічы.

| | |
|---|---|
| (39 + 49) : 11 | 12 · 4 + (90 – 38) |
| 6 · (58 – 45) | 99 : 33 – 72 : 24 |

**6.** Рашы ўраўненні.

| | | |
|---|---|---|
| $x$ + 19 = 100 | 21 + $a$ = 70 | $c$ – 23 = 57 |
| 81 – $y$ = 16 | 100 – $b$ = 3 | $d$ – 25 = 43 |

**7.** Рашы ўраўненні.

| | | |
|---|---|---|
| 5 · $m$ = 95 | $k$ · 4 = 84 | $x$ · 13 = 52 |
| $n$ : 18 = 4 | $t$ : 10 = 6 | 91 : $y$ = 13 |



Правообладатель Национальный институт образования

**8.** Састаў выразы і знайдзі іх значэнні.

| $c$ | 13 | 15 | 16 | 18 |
|---|---|---|---|---|
| $100 - c \cdot 3$ | ? | ? | ? | ? |
| $5 \cdot c - c$ | ? | ? | ? | ? |

**9.** Устаў прапушчаныя лікі, каб атрымаліся правільныя роўнасці.

$27 \cdot 3 = 39 + ?$ $\quad$ $16 \cdot ? = 10 \cdot 8$

$2 \cdot 38 = 100 - ?$ $\quad$ $? \cdot 2 = 100 : 2$

**10.** Купілі 5 пакетаў з грунтам для расады агародніны і 4 такія ж па масе пакеты з грунтам для расады кветак. Знайдзі масу аднаго пакета, калі ўсяго купілі 54 кг грунту.

**11.** Рашы задачу двума спосабамі.
Для кожнай групы дзіцячага сада трэба набыць 19 набораў каляровай крэйды і 12 набораў белай крэйды. Колькі ўсяго набораў купяць для трох груп?

**12.** Тату 39 гадоў. Узрост сына складае $\frac{1}{3}$ частку ўзросту таты. Дзядуля старэйшы за ўнука на 50 гадоў. Колькі гадоў дзядулю?

**13.** Дачцэ 9 гадоў. Яе ўзрост складае $\frac{1}{4}$ частку ўзросту мамы. Мама на 24 гады маладзейшая за бабулю. Колькі гадоў бабулі?

**14.** Шырыня прамавугольніка *ABCD* роўная $\frac{1}{3}$ частцы яго даўжыні. Даўжыня гэтага прамавугольніка — 9 см. Знайдзі перыметр прамавугольніка.



Правообладатель Национальный институт образования

## Урокі 63–65

### Правер сябе

**1.** Знайдзі няправільную роўнасць.

А $17 \cdot 4 = 68$ Б $3 \cdot 18 = 54$ В $48 : 12 = 4$ Г $36 : 2 = 19$

**2.** Знайдзі ўраўненне, рашэннем якога з'яўляецца лік 12.

А $4 \cdot x = 48$ Б $50 - x = 28$ В $60 : x = 4$ Г $x : 12 = 0$

**3.** У якім выпадку правільна знойдзена $\frac{1}{5}$ частка ад 15 мін?

А 20 мін Б 3 мін В 75 мін Г 10 мін

**4.** Знайдзі выраз, які з'яўляецца рашэннем задачы.
У пяці аднолькавых сшытках $c$ аркушаў. Колькі аркушаў у трох такіх сшытках?

А $c : 5 : 3$ Б $c : 3 \cdot 5$ В $c : 5 \cdot 3$ Г $c : 3 : 5$

**5.** Знайдзі правільны адказ задачы.
Як зменіцца перыметр прамавугольніка, калі яго даўжыню павялічыць на 2 см, а шырыню паменшыць на 2 см?

А Павялічыцца на 8 см. Б Не зменіцца.

В Паменшыцца на 8 см. Г Павялічыцца на 4 см.



Правообладатель Национальный институт образования

## Заданні і праекты

У цырку фокуснік паказвае нам фокусы, і мы можам бачыць прадметы не так, як яны выглядаюць на самай справе. У матэматыцы таксама можна паказаць некалькі фокусаў з фігурамі, у якіх мы няправільна ацэнім памеры фігур або іх размяшчэнне.

**1.** Падумайце, які з чырвоных адрэзкаў даўжэйшы. Праверце з дапамогай вымярэнняў.



Падумайце, што на малюнку перашкаджала вам параўнаць даўжыні адрэзкаў.

**2.** Як вы думаеце, які чорны круг большы — злева або справа?



На самай справе кругі аднолькавыя. Што на малюнках перашкаджала вам параўнаць памеры кругоў?

**3.** Знайдзіце або зрабіце падобныя малюнкі фігур. Пакажыце гэтыя фокусы з фігурамі сябрам у класе.



Правообладатель Национальный институт образования

# Урок 66

| Множнік | | Множнік | | Здабытак |
|---|---|---|---|---|
| 17 | · | 5 | = | 85 |
| 85 | : | 5 | = | 17 |
| 85 | : | 17 | = | 5 |

Каб праверыць, ці правільна выканана множанне, разважай так:

1. Калі здабытак двух лікаў падзяліць на адзін з множнікаў, атрымаецца другі множнік.
2. Дзялю здабытак 85 на адзін з множнікаў... Атрымліваю другі множнік...
3. Значыць, множанне выканана правільна.

**1.** Вылічы. Выканай праверку.

| | | | |
|---|---|---|---|
| 10 · 4 | 27 · 3 | 9 · 10 | 6 · 15 |
| 18 · 4 | 25 · 4 | 5 · 18 | 2 · 50 |

**2.** Знайдзі значэнні выразаў.

| | |
|---|---|
| 61 – 72 : 4 + 12 | 2 · (48 – 17) + 38 |
| 12 + 36 : 3 · 7 | 11 – (35 + 42) : 7 |

**3.** Састаў і рашы ўраўненні.

- Да ліку 34 дадалі невядомы лік і атрымалі 83.
- Невядомы лік паменшылі на 12 і атрымалі 27.

**4.** Параўнай.

(58 кг – 24 кг) · 2 ? (58 кг – 24 кг) : 2
(39 л + 16 л) : 5 ? (38 л + 17 л) : 5
80 мін – 1 г 20 мін ? 60 мін – 1 г

У якіх выпадках можна выканаць параўнанне без вылічэнняў?

Правообладатель Национальный институт образования

**5.** У садзе сабралі 92 кг агрэсту, чорных парэчак і маліна. Агрэсту сабралі 48 кг. Маса сабраных малін склала $\frac{1}{6}$ частку масы агрэсту. Колькі кілаграмаў чорных парэчак сабралі?

**6.** Рашы задачу рознымі спосабамі.
З двух кавалкаў тканіны даўжынёй 48 м і 46 м вырашылі пашыць палаткі. На кожную палатку расходуецца 4 м тканіны. Усяго пашылі 11 палатак. Колькі метраў тканіны засталося?

**7.** У спальным пакоі дзіцячага сада ўздоўж сцяны стаяць 6 ложкаў. Кожны ложак шырынёй 5 дм. Даўжыня сцяны — 5 м 5 дм. Паміж ложкамі аднолькавыя прамежкі. Якой будзе даўжыня прамежку паміж ложкамі?



Яна кажа:

Даўжыня прамежку — $\frac{1}{2}$ частка метра.

Ці праўду кажа Яна?

Віця памножыў 6 на 13 і атрымаў 98. Правер, ці не памыліўся Віця.

**1.** Вылічы. Выканай праверку.

14 · 5 4 · 19 28 · 3 6 · 13

**2.** Для афармлення дзіцячай кнігі мастаку трэба зрабіць 56 малюнкаў. За першы тыдзень мастак зрабіў 24 малюнкі, а за другі тыдзень — у 2 разы менш. Колькі малюнкаў засталося зрабіць мастаку?



Правообладатель Национальный институт образования

# Урок 67

| Дзялімае | | Дзельнік | | Дзель |
|---|---|---|---|---|
| 95 | : | 5 | = | 19 |
| 19 | · | 5 | = | 95 |

Каб праверыць, ці правільна выканана дзяленне, можна разважаць так:

1. Калі дзель памножыць на дзельнік, атрымаецца дзялімае.
2. Множу дзель 19 на дзельнік 5. Атрымліваю дзялімае 95.
3. Значыць, дзяленне выканана правільна.

**1.** Вылічы. Выканай праверку дзялення спосабам знаходжання дзялімага.

| | | | |
|---|---|---|---|
| 45 : 3 | 72 : 6 | 51 : 17 | 100 : 25 |
| 98 : 2 | 80 : 5 | 90 : 15 | 100 : 2 |

**2.** Састаў выразы і знайдзі іх значэнні.

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Складаемае | 17 · 4 | 1 · 97 | 80 : 10 | 95 : 5 |
| Складаемае | 75 : 25 | 99 : 33 | 29 · 3 | 71 : 71 |

**3.** Рашы ўраўненні.

| | | |
|---|---|---|
| $m : 3 = 16$ | $n + 38 = 45$ | $y \cdot 4 = 72$ |
| $4 \cdot y = 92$ | $93 - n = 14$ | $72 : m = 36$ |

**4.** Выберы схему. Рашы задачу.

У Аркадзя ў 4 разы больш фламастараў, чым у Валі. Усяго ў дзяцей 40 фламастараў. Колькі фламастараў у кожнага дзіцяці?

1

2

3



Правообладатель Национальный институт образования

**5.** У садзе 32 грушы, а яблынь — у 3 разы больш. Яблыні пасаджаны ў 8 радоў, пароўну ў кожным радзе. Колькі яблынь у адным радзе?

**6.** У горадзе *А* было 68 магазінаў, у горадзе *В* — на 12 магазінаў больш. Праз год колькасць магазінаў у горадзе *А* павялічылася на 3, а ў горадзе *В* — паменшылася на 3. У якім горадзе стала праз год больш магазінаў? На колькі больш?

Якім будзе адказ задачы, калі ў яе ўмове слова «паменшылася» замяніць на слова «павялічылася»? Здагадайся і правер вылічэннем.

**7.** Пабудуй прамавугольнік з даўжынямі старон 5 см і 2 см. Абазнач яго літарамі. Вылічы перыметр прамавугольніка.

**8.** Караліна загадала два лікі. Спачатку гэтыя два лікі яна перамножыла, а затым большы лік падзяліла на меншы і атрымала роўныя вынікі. Якія лікі магла загадаць Караліна?

Ці правільна, што пры дзяленні 84 на 7 атрымаецца 12?

**1.** Вылічы. Выканай праверку дзялення спосабам знаходжання дзялімага.

51 : 3 72 : 4 96 : 16 81 : 27

**2.** Спартсмены заваявалі ў 3 разы больш сярэбраных медалёў, чым залатых. Усяго яны заваявалі 20 залатых і сярэбраных медалёў. Колькі сярэбраных медалёў заваявалі спартсмены?



Правообладатель Национальный институт образования

# Урок 68

| Дзялімае | | Дзельнік | | Дзель |
|---|---|---|---|---|
| 56 | : | 14 | = | 4 |
| 56 | : | 4 | = | 14 |

Каб праверыць, ці правільна выканана дзяленне, можна разважаць так:

1. Калі дзялімае падзяліць на дзель, то атрымаецца дзельнік.
2. Дзялю дзялімае 56 на дзель 4. Атрымліваю дзельнік 14.
3. Значыць, дзяленне выканана правільна.

**1.** Вылічы. Выканай праверку дзялення спосабам знаходжання дзельніка.

| | | | |
|---|---|---|---|
| 66 : 6 | 78 : 2 | 93 : 31 | 70 : 14 |
| 72 : 4 | 65 : 5 | 88 : 22 | 60 : 12 |

**2.** Вылічы. Выканай праверку.

| | | | |
|---|---|---|---|
| 45 · 2 | 23 · 4 | 7 · 12 | 5 · 16 |

**3.** Састаў правільныя роўнасці і няроўнасці, выкарыстоўваючы выразы.

| | | | |
|---|---|---|---|
| 28 · 2 : 4 | (100 – 76) · 3 | (49 + 35) : 6 | 48 : 2 · 3 |

**4.** Састаў выразы, з дапамогай якіх можна знайсці прапушчаныя лікі. Знайдзі значэнні гэтых выразаў.

| $a$ | 9 | ? | 19 | ? | 3 | ? |
|---|---|---|---|---|---|---|
| $b$ | ? | 8 | ? | 4 | ? | 11 |
| $a \cdot b$ | 54 | 64 | 76 | 56 | 51 | 77 |



Правообладатель Национальный институт образования

**5.** З аднаго кавалка дроту зрабілі 9 аднолькавых вырабаў, і яшчэ застаўся кавалак дроту даўжынёй 15 см. Якой даўжыні быў увесь кавалак дроту, калі на адзін выраб ідзе кавалак дроту даўжынёй 5 см?

**6.** Параўнай і рашы задачы.

- У адным пакеце на 2 фінікі больш, чым у другім. Усяго ў двух пакетах 24 фінікі. Колькі фінікаў у кожным пакеце?
- У адным пакеце ў 2 разы больш фінікаў, чым у другім. Усяго ў двух пакетах 24 фінікі. Колькі фінікаў у кожным пакеце?

**7.** Складзі і рашы задачу.

| Маса адной каробкі (кг) | Колькасць каробак (шт.) | Маса ўсіх каробак (кг) |
|---|---|---|
| 6 | 10 | ? |
| 6 | 3 | ? |

На ? больш

**8.** Пабудуй прамавугольнік *ABCD*, перыметр якога роўны 16 см, а шырыня — 2 см.

Ці правільнае сцвярджэнне, што пры дзяленні 76 на 4 атрымаецца 18?

**1.** Вылічы. Выканай праверку дзялення спосабам знаходжання дзельніка.

54 : 3 91 : 13 84 : 14 60 : 15

**2.** Гаспадыня на рынку прадавала алычу і чарэшню. Алычы яна прадала 14 кг, што складае трэцюю частку масы прададзенай чарэшні. Колькі ўсяго кілаграмаў алычы і чарэшні прадала гаспадыня?



Правообладатель Национальный институт образования

(Назва ўстановы адукацыі)

| Навучальны год | Імя і прозвішча вучня | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Адзнака вучню за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |

Вучэбнае выданне

**Мураўёва** Галіна Леанідаўна
**Урбан** Марыя Анатольеўна

# МАТЭМАТЫКА

Вучэбны дапаможнік для 3 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання

У дзвюх частках

Частка 1

Нач. рэдакцыйна-выдавецкага аддзела *С. П. Маляўка*
Рэдактар *Н. М. Мамчыц*
Мастакі *І. В. Лазерка, Ю. М. Галавейка, З. П. Болцікава*
Мастацкі рэдактар *Н. А. Хромава*
Камп'ютарная вёрстка *Ю. М. Галавейка*
Карэктары *Д. Р. Лосік, Н. В. Федарэнка*

Падпісана да друку 26.04.2021. Фармат 70 x 100/16. Папера афсетная.
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 11,05. Ул.-выд. арк. 4,8. Тыраж 15 415 экз. Заказ

Навукова-метадычная ўстанова «Нацыянальны інстытут адукацыі»
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі
выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/263 ад 02.04.2014. Вул. Караля, 16, 220004, г. Мінск

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва "Беларускі Дом друку"».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка
друкаваных выданняў № 2/102 ад 01.04.2014. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, г. Мінск

Правообладатель Национальный институт образования